Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.
№131 (28495)
12 ЛІПЕНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



Як вырашыць праблему палігонаў і кар'ераў? МС



Бальніца ў спадчыну МС



Ці быць садку ў Бараўлянах? МС

*ЛІЧБА ДНЯ*

**1,3%**

*складзе рост ВУП у Беларусі па выніках 2017 года паводле прагнозу Еўразійскага банка развіцця. Тэндэнцыя аднаўлення эканамічнага росту ў краіне захоўваецца. Па выніках студзеня — мая прырост ВУП склаў 0,9% да студзеня — мая 2016 года. «Паводле нашых ацэнак, чакаецца захаванне станоўчай дынамікі і выхад па выніках года на рост ВУП на ўзроўні 1,3%», — гаворыцца ў макрааглядзе фінансавай установы. У ЕАБР таксама канстатуюць прырост аб'ёмаў прамысловай вытворчасці ў Беларусі — у маі ён склаў 8,4%. Станоўчая дынаміка захавалася ў здабыўной і апрацоўчай прамысловасці. Гадавая інфляцыя па выніках мая знізілася да 6,1% з 6,3% у красавіку, працягваючы заставацца ніжэй за мэтавы ўзровень Нацбанка Беларусі ў 9%.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9794 | ▲ |
| Еўра | 2,2549 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0762 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Канікулы з водарам сена



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пяцікласніца Шаркаўшчынскай школы, пераможца міжнароднага экалагічнага конкурсу «Зялёная планета» Юлія КАЖАН у час летніх вакацый дапамагае свайму дзеду Васілю ДЗЯМ'ЯНАВУ на нарыхтоўцы сена ў вёсцы Грыгараўшчына.

Ідэя+

Сумесны праект «Звязды» і Камітэта экаміні Магілёўскага аблвыканкама

## ЗЛУЧАЮЧЫ ТЭХНАЛОГІІ

**У кожным чалавеку, па сутнасці, жыве вынаходнік. Сведчанне таму шматлікія конкурсы на лепшыя ідэі. Але чаму ж тады мы пастаянна гаворым пра тое, што нам не хапае чагосьці новага і перадавога? Менавіта на гэтую тэму мы сёння гутарым з дырэктарам магілёўскай інавацыйнай фірмы СТРІМ Сяргеем РАДКЕВІЧАМ** *(на фота)*. **Дарэчы, СТРІМ расшыфроўваецца, як сучасныя тэхнічныя рашэнні і метады. Іншымі словамі, тут не толькі прапануюць ідэі, але яшчэ і ўкараняюць іх у жыццё.**

### 100 ІДЭЙ ДЛЯ ПРАДПРЫЕМСТВА



Гэта сёння Сяргей Радкевіч і яго аднадумцы паспяховыя бізнесмены, але ў пачатку 2000-х, калі нават само слова «інавацыя» практычна не сустракалася ў лексіконе беларусаў, усё было інакш. Чатыры таварышы, выпускнікі тэхнічных ВНУ, якія працавалі інжынерамі на адным з магілёўскіх прадпрыемстваў, загарэліся жаданнем стварыць нешта карыснае для народнай гаспадаркі краіны. У якім стане яна знаходзілася ў канцы 90-х, не трэба тлумачыць. Шалёная інфляцыя, развал, адчай, няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Наогул дзіўна, што знаходзіліся людзі з «залатымі» мазгамі, якія і не думалі збегчы ў больш паспяховыя краіны і даражэй сябе прадаць. Нават пры тым, што іх ідэі на родным прадпрыемстве ўхвалялі, але браць на ўзбраенне адмаўляліся. «Гэта я зараз разумею, чаму так адбывалася, — усміхаецца Сяргей. — Праблемы, як казаў прафесар Праабражэнскі, пачынаюцца з бязладдзя ў галаве. Бязладдзе было паўсюды. Кіраўніцтва разумела, што трэба рабіць нейкія новыя рэчы, але калі незразумелыя мэты, праграмы, схемы матывацыі, недастаткова фінансаў, гэта ўсё накладае абмежаванні».

СТАР. 4

■ На слыху

## ШТО НОВАГА Ў САЦЫЯЛЬНЫМ АБСЛУГОЎВАННІ?

### У Беларусі з'явяцца замяшчальныя сем'і для старых

**Плануецца, што ў найбліжэйшы час у нашай краіне будуць уведзены новыя формы сацыяльнага абслугоўвання і стандарты якасці сацыяльных паслуг. Спросціцца і працэдура дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Гэтыя і іншыя навацыі прадугледжаны Законам «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным абслугоўванні».**

### «Замяшчальная сям'я»: што гэта такое

Штогод павялічваецца сярэдняя працягласць жыцця. Але пры гэтым аднычасова становіцца больш старых, у тым ліку адзінокіх і адзінока пражываючых. А гэта значыць, расце колькасць людзей, якія маюць патрэбу ў сацыяльным абслугоўванні. У апошнія гады ў нашай краіне актыўна ўкараняліся новыя віды сацыяльных паслуг. Гэта і сацыяльная перадышка, і сацыяльны патранат, і суправаджанае пражыванне, і паслугі няні. Зараз, каб яшчэ больш грамадзян, што маюць патрэбу ў сацыяльным абслугоўванні, атрымалі яго, законам уведзена яшчэ адна форма сацыяльнага абслугоўвання — замяшчальная сям'я. Гэта свайго роду аналаг прыёмнай сям'і.

Як паведаміла «Звяздзе» **начальнік аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА,** любая фізічная асоба пры жаданні зможа ўдзельнічаць у абслугоўванні пажылога чалавека ці інваліда (які павінен быць паўналетнім), але пры гэтым іх не павінны звязваць адносіны, якія абавязваюць законам утрымліваць дадзенага грамадзяніна. Прадугледжана, што яны будуць разам жыць і весці агульную гаспадарку.

СТАР. 4

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ Ў ЭКАНАМІЧНЫЯ ДЫВІДЭНДЫ

## Прэзідэнт назваў прыярытэты знешняй палітыкі дзяржавы

**Без выстройвання адносін з іншымі краінамі, без новых падыходаў да знешнепалітычнай дзейнасці ў сённяшнім свеце не абысціся. Бо гэта — адзін з чыннікаў эканамічнага поспеху дзяржавы. Як варта развіваць знешнюю палітыку? На што трэба скіроўваць больш увагі? Асноўныя кірункі работы ў гэтай сферы ўчора агучыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па прыярытэтах знешняй палітыкі Беларусі на сучасным этапе.**

Адны з важных задач, якія стаяць сёння, — павышэнне ролі нашай краіны ў сусветнай палітыцы, а таксама эфектыўнасці знешнеэканамічнай дзейнасці. Пры гэтым прыярытэтамі ў знешняй палітыцы застаюцца шматвектарнасць і развіццё супрацоўніцтва і з Усходам, і з Захадам. Стратэгічным саюзнікам Беларусі застаецца Расія, якая ў той жа час і асноўны гандлёва-эканамічны партнёр: з $2 млрд экспарту, якія наша краіна дабавіла ў студзені— маі бягучага года, 55,6% выпадае менавіта на Расію. Нягледзячы на ўзнікаючыя перашкоды на гэтым рынку, беларускія тавары застаюцца запатрабаванымі ў расійскага спажыўца.

— Калі расіяне сёння кажуць пра тое, што эмбарга, санкцыі — гэта шанц для іх эканомікі, вы павінны разумець, што гэта не меншы шанц для нашай эканомікі. Таму што нашы народнагаспадарчыя сувязі вельмі пераплеценыя і каапераціі — найглыбейшая. Без нашых тавараў Расіі будзе абысціся складана, — адзначыў беларускі лідар. — Ва ўмовах, якія склаліся, трэба спакойна, упэўнена і настойліва працягваць работу з расійскім бокам.

Актуальнай застаецца работа ў межах інтэграцыйных праектаў: Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, Еўразійскага эканамічнага саюза, Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а таксама з Еўрапейскім саюзам. Пры гэтым Прэзідэнт нагадаў пра беларускую ідэю супрацоўніцтва паміж рознымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі. Гэта будзе карысна і для Расіі, і для краін Захаду і Усходу, лічыць Аляксандр Лукашэнка:

— Наш сусед Еўрасаюз перажывае няпростыя часы. Сёння там сутыкнуліся з цэлым шэрагам сур'ёзных выклікаў. Але, смею запэўніць, з гэтымі выклікамі Еўрапейскі саюз справіцца. Я ўжо шмат разоў казаў, што нам патрэбны моцны Еўрапейскі саюз. Як у эканамічным, так і ў палітычным плане. Еўрапейскі саюз — гэта адна з апор шматпалярнага свету. Далейшая нармалізацыя адносін з Еўрасаюзам застаецца ў ліку нашых важных знешнеэканамічных прыярытэтаў.

Цяпер санкцыі з беларускіх прадпрыемстваў зняты, ёсць зрухі ў пазіцыі ЕС ва ўзаемадзеянні нашай краіны з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам, Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, уступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Нельга згубіць гэты момант, варта скарыстацца новымі магчымасцямі рынку. Тым больш што зараз назіраецца пад'ём у сусветнай эканоміцы.

Асобнае пытанне — дыверсіфікацыя экспарту. Яе станоўчы прыклад — супрацоўніцтва з краінамі Лацінскай Амерыкі. За апошнія 16 гадоў ён павялічыўся больш чым у пяць разоў: ад 110 да 590 мільёнаў долараў, сальда станоўчае. Зараз таксама назіраецца развіццё ўзаемадзеяння са Злучанымі Штатамі Амерыкі, Кітаем, Індыяй, Пакістанам, В'етнамам, Афрыкай, краінамі Паўднёвай Азіі.

Асобна кіраўнік дзяржавы закранўў тэму новай стратэгіі экспарту, паляпшэння яго якаснай структуры. Тое, што больш за 80% экспарту ў Еўропу складаюць сыравіна і паўфабрыкаты, не самы лепшы паказчык. Таму трэба імкнуцца да стварэння сумесных вытворчасцяў, да інавацыйнасці і высокатэхналагічнасці прадукцыі, выводзіць айчынных экспарцёраў у міжнародныя вытворчыя ланцужкі, зніжаць матэрыяла- і энергаёмістасць вытворчасці, забяспечваць заўжды якасную прадукцыю.

Акрамя таго, варта нарошчваць экспарт паслуг. Значыць, прасоўваць не толькі беларускі тавар, але і вучобу ў нашай краіне, адпачынак, спорт, лячэнне. Прывабліваць замежных турыстаў, развіваць адносіны з беларускай дыяспарай за мяжой, вяртаць культурныя каштоўнасці ў краіну.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

### ❍ У тэму

**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Беларусі:**

— Экспартны кірунак з'яўляецца абсалютным прыярытэтам у рабоце МЗС і пасольстваў. Са снежня 2016 года мы выйшлі на ўстойлівую памесячную тэндэнцыю росту экспарту. Яна захоўваецца паўгода, і ў маі мы прыбавілі ўжо 30%. Важна, што ў 2017 годзе павелічэнне экспарту забяспечана як за кошт росту сярэдніх экспартных цэн (амаль на 16%), так і за кошт фізічнага аб'ёму экспарту па большасці таварных груп — 8 з 10. З трох мільярдаў долараў агульнага прыросту экспарту $1,7 млрд прыходзіцца на несыравінныя тавары. Гэта гаворыць пра істотнае паляпшэнне таварнай структуры беларускага экспарту.

# ЗАХАВАЦЬ СЛАВЯНСКУЮ КУЛЬТУРУ

## Такія задачы паставілі перад сабой удзельнікі XIX Сусветнага кангрэса рускай прэсы

**Пра гэта казаў прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі рускай прэсы Віталь ІГНАЦЕНКА на цырымоніі ўскладання вянка ад удзельнікаў кангрэса да манумента на Плошчы Перамогі. Мерапрыемствы ў Беларусі праходзіць з 11 па 15 ліпеня. Сёння ў яго рамках адбудуцца пленарнае пасяджэнне і дзве панэльныя сесіі.**

— Галоўная тэма нашага кангрэса — захаванне рускамоўнай прасторы, захаванне культуры — славянскай, не абавязкова рускай. Гэта вельмі важна для ўсіх, хто бачыць у славянскіх народаў вялікую душу, вялікі маральны пачатак. Усё гэта ў нас ёсць. Мы ўсяляк стараемся, каб наша прэса, тэлебачанне, радыё былі неадрыўна звязаны з Радзімай, — адзначыў Віталь Ігнаценка. — Калі толькі мы пачыналі гэтую вялікую працу — аб'яднаць рускую прэсу, — то было ўсяго 23 краіны. А сёння іх 86.

Ён таксама дадаў, што ў XIX Сусветным кангрэсе рускай прэсы прымаюць удзел каля 200 чалавек больш чым з 50 краін свету. Удзельнікаў кангрэса чакаюць дыскусіі на розныя тэмы — як агульныя, так і прафесійныя. «Сёння ўсіх цікавіць развіццё інтэрнэту, месца рускай прэсы ў сеціве, што мы там павінны даваць і як абменьвацца матэрыяламі, якую ролю будуць выконваць блогеры, як іх рыхтаваць», — дадаў Віталь Ігнаценка.

Арганізатарамі XIX Сусветнага кангрэса рускай прэсы выступаюць Сусветная асацыяцыя рускай прэсы, Міністэрства інфармацыі Беларусі і Фонд супрацоўніцтва з рускамоўнай прэсай — Фонд САРП. У наступныя дні ўдзельнікі кангрэса наведаюць Віцебск і Полацк, пабываюць на БелАЗе і ў парку-музеі інтэрактыўнай гісторыі «Сула».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

### ❍ Гавораць удзельнікі

**Першы намеснік генеральнага дырэктара ТАСС Міхаіл ГУСМАН:**

— Сёння, ва ўмовах сучасных тэхналагічных выклікаў, настаў час пагаварыць і аб лічбавай рэвалюцыі ў нашай прафесійнай справе. Мы ўдзячныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, які і запрасіў кангрэс у вашу краіну. Сама гутарка пойдзе пра тое, як рускамоўнай прэсе выжываць у розных краінах у гэтым няпростым свеце. Мы падзелімся вопытам, падзелімся ведамі. Усе мы шчаслівыя, што прыехалі ў Мінск, у сталіцу цудоўнай краіны. Дарэчы, наступны юбілейны XX кангрэс будзе праходзіць у Брукліне, горад Нью-Ёрк.

**Выдавец часопіса «Мая Мальта» Анастасія ЛЕСНІКАВА:**

— Штогадовыя кангрэсы, безумоўна, нам вельмі дапамагаюць абменьвацца вопытам і кантактамі, атрымліваць прафесійныя кансультацыі. Зноў жа, мы ствараем нейкія альянсы, мы можам абменьвацца і фатаграфіямі, і тэкстамі, і рэкамендаваць добрых спецыялістаў. І гэта сапраўды адзін з інструментаў, які дапамагае нам трымацца на плаве. Безумоўна, усе рускамоўныя выданні за мяжой трымаюцца на велізарным жаданні тых, хто гэта робіць. Патрабуецца вельмі вялікая ініцыятыва.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У ЗША школьнік даведаўся нумар тэлефона шэфа Пентагона і ўзяў у яго інтэрв'ю



Амерыканскі школьнік Тэдзі Фішэр дзякуючы ўвазе да дэталяў даведаўся нумар службовага тэлефона міністра абароны ЗША Джэймса Мэціса і ўзяў у яго інтэрв'ю працягласцю 45 хвілін. Пра гэта паведаміла газета New York Post.

Фішэр, які вучыцца ў адной з сярэдніх школ штата Вашынгтон, цікавіцца журналістыкай і знешняй палітыкай. У публікацыі газеты The Washington Post ад 11 мая ён звярнуў увагу на фотаздымак Мэціса і яго памочніка з папкай дакументаў. На адной з папер быў прымацаваны стыкер, на якім пры павелічэнні здымка можна было прачытаць імя міністра абароны ЗША і разгледзець нумар тэлефона.

Школьнік спачатку патэлефанаваў у газету, якая ў далейшым зняла гэтую фатаграфію са сваёй электроннай версіі, а затым Фішэр вырашыў паспрабаваць узяць інтэрв'ю і для гэтага скарыстаўся заўважаным на здымку нумарам тэлефона, даслаўшы міністру абароны СМС наступнага зместу: «Ці не маглі б вы даць інтэрв'ю? Дарэчы, нумар вашага асабістага тэлефона стаў даступны амерыканскай публіцы. Добрага вам дня!»

Мэціс пагадзіўся даць інтэрв'ю да здзіўлення юнага амерыканца. «Уся гэтая гісторыя ўяўляла сабой цэлую чараду цудаў», — прызнаўся затым школьнік.

## Баевікі абвясцілі аб гібелі верхавода «Ісламскай дзяржавы»

Баевікі тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава» паведамілі аб гібелі кіраўніка арганізацыі Абу Бакр аль-Багдадзі. Пра гэта паведаміў тэлеканал «Ас-Сумарыя» са спасылкай на мясцовую крыніцу ў іракскай правінцыі Найнава.

Паводле слоў крыніцы, баевікі ІД выступілі з кароткай заявай, у якой паведамілі пра смерць свайго лідара Абу Бакр аль-Багдадзі, а таксама пра тое, што ў найбліжэйшы час паведамяць імя «новага халіфа».

Раней іранскія СМІ распаўсюдзілі здымкі, якія пацвярджаюць гібель аль-Багдадзі. У сярэдзіне чэрвеня ў Мінабароны Расіі паведамілі, што ў канцы мая ў Сірыі ў выніку расійскага авіяўдару, па папярэдніх даных, быў знішчаны верхавод ІД і да 300 баевікоў.

## У Германіі падлетак раздаў 10 тысяч еўра, каб знайсці сяброў

У Германіі 13-гадовы падлетак раздаў аднагодкам каля 10 тысяч еўра, каб заваяваць іх павагу і сяброўства. Пра гэта піша газета Suddeutsche Zeitung.

Інцыдэнт адбыўся ў мястэчку Бад-Тольц. 13-гадовы хлопчык употай ад бацькоў узяў з дому зберажэнні і стаў раздаваць іх сваім знаёмым. Большасць грашовых падарункаў, памер якіх быў ад 100 да амаль 2,5 тыс. еўра, дзіця раздало ўдзельнікам мясцовай падлеткавай футбольнай каманды. Аб тым, што здарылася, некаторыя дзеці паведамілі бацькам, а тыя — паліцыі. Высветлілася, што грошы падлетак дарыў, каб узняць сваю папулярнасць сярод знаёмых.

### ■ Погляд

# Меркаваная небяспека мірнага атама ці намераная палітызацыя?

**Аб айчыннай АЭС гавораць на найбуйнейшых міжнародных пляцоўках. Не так даўно гэтае пытанне абмяркоўвалася на ПА АБСЕ ў Мінску і на сустрэчы кіраўнікоў краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў Варшаве. Як правіла, тэму распачынае Літва, на мяжы з якой будуецца беларуская станцыя. Вось толькі ці сапраўды ініцыятарамі такіх размоў рухае апасенне за бяспеку Еўропы або яны маюць іншыя мэты?**

Дарэчы, 26-я сесія штогадовай Парламенцкай асамблеі АБСЕ паказала досыць цвярозае ўспрыманне заходнееўрапейскімі парламентарыямі пытанняў, якія датычацца дзяржаў Усходняй Еўропы. Удзельнікі сесіі выказвалі сваё асабістае меркаванне, якое магло не супадаць з меркаваннем палітычнага блока, у які ўваходзяць іх краіны.

Сапраўды, чарнобыльская трагедыя пакінула глыбокі след на зямлі. Але яна не стала перашкодай для будаўніцтва атамных электрастанцый, у тым ліку ў Еўропе.

Тым не менш «страшылкі» аб будаўніцтве БелАЭС парламентарыі Літвы спрабавалі прасунуць праз рэзалюцыю на Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску. Тэма не была ўхвалена падчас пасяджэння агульнага камітэта па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі.

«Дэпутаты з іншых краін пагадзіліся з намі, што нельга падыходзіць аднабока да падобных пытанняў, тым больш што атамная энергетыка развіваецца ў большасці краін — удзельніц АБСЕ, — пракаментаваў галасаванне **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Андрэй РЫБАК**. — І гэта таксама адзін з аспектаў нашай прапановы аб інтэграцыі — не трэба прыходзіць з нейкімі асобнымі міжкраінавымі пытаннямі на пасяджэнне АБСЕ, якая аб'ядноўвае 57 краін. Падыходы павінны быць агульнымі, і добра, што з нашай пазіцыяй пагадзілася большасць дэлегатаў».

Практычна ў той жа час на мінулым тыдні прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ на сустрэчы кіраўнікоў краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў Варшаве з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам казала пра важнасць бяспекі рэгіёна і пагрозу, якую ўяўляе БелАЭС. Яна заявіла, што Беларуская АЭС і газаправод «Паўночны паток — 2» могуць быць выкарыстаны Расіяй у якасці інструмента неканвенцыянальнага шантажу.

Дарэчы, менавіта тэме бяспекі БелАЭС удзяліў асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка падчас свайго выступлення на адкрыцці летняй сесіі ПА АБСЕ.

«Я гарантую вам, еўрапейцам, нягледзячы на тое, што мы не адзіная краіна, якая займаецца мірным атамам: мы пабудуем самую бяспечную станцыю. У нас пасля катастрофы ў Чарнобылі не так проста было прыняць гэтае рашэнне. І мы разумеем сёння, што галоўнае пытанне — бяспека. Тое, што хвалюе і еўрапейцаў, і нашых суседзяў. Мы маем намер завяршыць будаўніцтва гэтай станцыі ў тэрмін з няўхільным выкананнем нормаў і стандартаў МАГАТЭ», — падкрэсліў беларускі лідар.

З тым, што будаўніцтва БелАЭС не павінна палітызавацца, згодныя і парламентарыі іншых краін. «Вядома, атамная энергетыка вельмі эфектыўная, але ў той жа час яна нясе пэўныя рызыкі. Атамная станцыя ў Беларусі павінна быць у першую чаргу бяспечнай па сваіх тэхнічных характарыстыках. Пытанні будаўніцтва такіх аб'ектаў, як атамныя станцыі, у прыватнасці БелАЭС, не павінны палітызавацца, а павінны ў першую чаргу разглядацца з пункту гледжання навукі», — пракаментавала сітуацыю **дэлегат сесіі ПА АБСЕ ад ЗША, кангрэсмен ад штата Вісконсін Гвен МУР**, якая ўдзельнічала ў пасяджэнні камітэта па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі.

Яна лічыць, што супярэчнасці па будаўніцтве АЭС існуюць яшчэ і таму, што станцыя будуецца на мяжы двух дзяржаў. На яе думку, яны павінны канструктыўна абмяркоўвацца. Пры гэтым, напэўна, на слове «канструктыўна» трэба зрабіць падвоены націск.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

■ Прыёмная кампанія — 2017

# Выпускнікам педагагічных класаў трэба паспяшацца

## Сёння беларускія ВНУ распачынаюць прыём дакументаў у абітурыентаў

**Прыёмныя камісіі чакаюць патэнцыяльных першакурснікаў да 17 ліпеня, такім чынам у маладых людзей будзе ўсяго шэсць дзён, каб канчаткова вызначыцца з прафесіяй.**

А з 18 ліпеня распачынаюцца уступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваныя толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць на кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове, таму і першым, і другім трэба падаць свае дакументы да 17 ліпеня.

Таксама варта паспяшацца з падачай дакументаў як на «бюджэт», так і на навучанне на платнай аснове і выпускнікам профільных педагагічных класаў, якія плануюць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без здачы ЦТ, толькі па выніках субяседавання. Яны павінны гэта зрабіць да 14 ліпеня (у іх ёсць усяго тры дні).

Падаваць дакументы можна толькі ў адну ВНУ і на адну спецыяльнасць. Праўда, ў шэрагу ВНУ практыкуецца агульны конкурс па факультэце ці на групу спецыяльнасцяў. А, напрыклад, аўтаматызаваная сістэма залічэння, якая дзейнічае ў БДУІР, дазваляе карэктаваць залічэнне ў залежнасці ад расстаноўкі абітурыентамі прыярытэтаў і наяўнасці незапоўненых месцаў на тых ці іншых спецыяльнасцях. У парадку ўбыванняня там можна пазначыць усе спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю (больш як трыццаць). Хоць дастаткова высокі працэнт абітурыентаў штогод указваюць усяго адну-дзве спецыяльнасці...

Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца прыёмнымі камісіямі штодня кожныя тры гадзіны: у 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00.

Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15-й гадзіне! Паводле новых патрабаванняў, інфармацыя аб дакументах, пададзеных у апошнія гадзіны да закрыцця прыёмных камісій, павінна быць даведзена да ведама абітурыентаў на наступны дзень (гэта значыць, 18 ліпеня) да 12 гадзін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Літаратурныя стасункі

# БУДЗЕМ З КНІГАЙ

**За Нацыянальную літаратурную прэмію сёлета змагаюцца 40 прэтэндэнтаў. Гэта амаль удвая больш, чым летась.**

Клопатам пра развіццё нашай літаратуры, выхаванне цікавасці да кніг айчынных аўтараў жывуць не толькі школьныя настаўнікі. Падаецца, што гэта — агульная справа выдаўцоў, журналістаў, а найперш — саміх аўтараў. Сёння членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі з'яўляецца каля 640 творцаў, якія жывуць і працуюць у розных рэгіёнах краіны. За мінулы год літаратары прадставілі чытачам каля 300 новых кніг, і ўжо сёлета колькасць новых выданняў перавысіла 150.

У ліку твораў, якія найбольш цікавыя чытачам і якіх, на жаль, пакуль нестае ў айчыннай літаратуры, — расповеды пра жыццё маленькіх вёсачак і мястэчак, простых людзей. Гэтыя тэксты маглі б зацікавіць беларусаў, лічыць **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** На думку Мікалая Іванавіча, нават той твор, які не адпавядае высокім агульнарэспубліканскім патрабаванням, але напісаны таленавіта, мае права на існаванне і прызнанне, хай толькі на мясцовым узроўні.

У сучасных варунках аўтару мала толькі выдаць кнігу і прадставіць яе на паліцах кнігарняў. Важная актыўная камунікацыя з чытачамі. І гэтая работа таксама ахвотна робіцца членамі Саюза пісьменнікаў. Так, **першы намеснік старшыні творчай суполкі Алена СТЭЛЬМАХ** распавяла, што сёлета ў Маладзечне напярэдадні фестывалю паэзіі і песні аўтары правялі мноства сустрэч на розных пляцоўках: у бальніцы, раённых электрасетках, школе мастацтваў.

— Паўсюль збіраліся вялікія аўдыторыі. Гэтыя спатканні творцаў са слухачамі, чытачамі прайшлі ў вельмі шчырай, кранальнай атмасферы, — падзялілася Алена Анатолеўна. — Нам прыемна, што цяпер актыўна папаўняюцца шэрагі паэтаў-песеннікаў. Не так даўно да творчай суполкі далучыўся Алег Жукаў, літаральна нядаўна мы прынялі ў саюз Фёдара Баравога. Гэтыя асобы падмацоўваюць нашы сілы, з іх дапамогай можам ладзіць выступленні і ўкамерных аўдыторыях, і на вялікіх пляцоўках, напрыклад падчас святкавання 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы на яго радзіме ў Вязынцы.

Члены Саюза пісьменнікаў Беларусі актыўна прымаюць удзел у мерапрыемствах у межах рэспубліканскай акцыі «Лета з добрай кнігай», у кожным раёне, школе, летніку праходзяць сустрэчы з творцамі. Не застаецца па-за ўвагай і рэспубліканскі конкурс чытальнікаў «Жывая класіка».

Несумненна, важным у жыцці Саюза пісьменнікаў Беларусі станецца сёлетні Дзень беларускага пісьменства ў Полацку.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*


**Учреждение образования**
**«РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ИНСТИТУТ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ»**

объявляет прием в аспирантуру на 2017/2018 учебный год
(заочная, соискательство) по специальностям:
13.00.08 – теория и методика профессионального образования
19.00.07 – педагогическая психология.
Количество мест определено в соответствии с контрольными цифрами приема:
13.00.08 – теория и методика профессионального образования – 5
19.00.07 – педагогическая психология – 1
Прием документов с 1 по 20 сентября 2017 года по адресу:
220004, г. Минск, ул. К. Либкнехта, 32, к.116, аспирантура, тел. 200 07 07
УНП 100419924


ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ВА УКРАІНУ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ?

**Нядаўна прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка падчас пасяджэння Савета нацыянальнай бяспекі і абароны заявіў, што ў хуткім часе іншаземцы змогуць трапіць на тэрыторыю суседняй дзяржавы толькі пасля працэдуры зняцця адбіткаў пальцаў.**

Дакументы, неабходныя для ўводу біяметрычнага кантролю на мяжы, адпаведнымі ведамствамі ўжо распрацаваны. Перш чым трапіць на тэрыторыю Украіны, трэба будзе не толькі здаць адбіткі пальцаў, а і паказаць фотаздымак у лічбавым фармаце. Праўда, дакладная дата ўступлення ў сілу новых правілаў перасячэння ўкраінскай мяжы пакуль невядомая. Але, паколькі гэтыя змяненні тычацца і многіх беларусаў, якія ездзяць у суседнюю краіну да сваякоў, на адпачынак ці шопінг, такая навіна стала адной з самых папулярных і абмяркоўваемых у апошнія дні.

«Звязда» вырашыла пацікавіцца, ці рыхтуюцца нашы пагранічнікі да падобных нававядзенняў на мяжы з Украінай. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Антон БЫЧКОЎСКІ,** іхняе ведамства па афіцыйных каналах не атрымлівала ад украінскага боку інфармацыі аб увядзенні біяметрычнага кантролю замежных грамадзян пры перасячэнні мяжы Украіны. «З беларускага боку міжнародныя пункты пропуску на беларуска-ўкраінскай мяжы функцыянуюць у ранейшым рэжыме, — адзначыў Антон Бычкоўскі. — На гэтым напрамку дзейнічаюць папярэдне ўстаноўленыя парадак і правілы перасячэння дзяржаўнай мяжы».

**Вераніка КАНЮТА.**

## ЯК ВЯРНУЦЬ ЗБОР НА ЎТРЫМАНСТВА?

### Растлумачылі ў Міністэрстве па падатках і зборах

**Грамадзяне, якія заплацілі збор паводле Дэкрэта №3 за 2015 ці 2016 год, маюць права на зварот грошай у некалькіх выпадках. Першы — калі яны ў 2017-м удзельнічалі ў фінансаванні дзяржвыдаткаў (напрыклад, адпрацавалі не менш за 183 дні). Другі — дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Трэці — прызнаны недзеяздольнымі ці інвалідамі (незалежна ад групы, прычыны, даты наступлення і тэрміну інваліднасці). Такія ўмовы прапісаны ў распараджэнні Прэзідэнта ад 5 ліпеня 2017 года «Аб звароце збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў».**

Падатак вяртаюць на падставе пісьмовай заявы. Трэба таксама прадставіць пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу. Заява можа быць пададзена прадстаўніком зацікаўленай асобы, які дзейнічае на падставе даверанасці, аформленай у адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам.

Грошы могуць вярнуць або на банкаўскі рахунак (для гэтага трэба пазначыць яго рэквізіты — нумар і тып рахунку, назву і код банка, код валюты), або наяўнымі сродкамі з касы структурнага падраздзялення Беларусбанка. Зрабіць гэта павінны за месяц з дня падачы заявы.

Усяго збор па Дэкрэце № 3 заплацілі 54 тысячы чалавек. У бюджэт пералічана каля 16,3 мільёна рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## «БОЛЬШАГА ШЧАСЦЯ І НЕ ТРЭБА»

### Пётр Клімук адзначыў юбілей на малой радзіме

**Двойчы Герой Савецкага Саюза, першы беларускі касманаўт Пётр Клімук прыехаў на малую радзіму, у Брэсцкі раён, каб адзначыць сваё 75-годдзе. Пётр Ільіч пабываў у сваёй роднай вёсцы Камароўцы, потым у Тамашоўцы, дзе працуе музей касманаўтыкі. Там лётчык-касманаўт сустракаўся са сваякамі, сябрамі, знаёмымі. Пазней ён сказаў, што большага шчасця і не трэба, чым сустракаць 75 гадоў на радзіме, на Брэстчыне.**



Фота БЕЛТА.

Годнага сына Беларусі павіншаваў з юбілеем кіраўнік дзяржавы. «Ваш жыццёвы шлях — яркі прыклад самаахвярнага служэння Айчыне. Мужнасць, прафесіяналізм, шырокая эрудыцыя, адказнасць і адданасць сваёй справе дазволілі Вам стаць выдатным лётчыкам-касманаўтам, двойчы Героем Савецкага Саюза, — гаворыцца ў віншаванні. — Мы ганарымся Вамі, сваім знакамітым земляком, першым беларусам, які падняўся ў космас». У круглай зале гарвыканкама сабралася шмат людзей, каб павіншаваць з юбілеем вядомага чалавека. Гонарам нашай Брэстчыны назваў касманаўта ў вітальным слове старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Ліс. Горача павіншаваў таварыша аднакласнік — Герой Беларусі Пётр Пракаповіч. Добрыя словы таксама сказалі дэпутаты, грамадскія дзеячы, моладзь. Ад ахвотных атрымаць аўтограф касманаўта адбою не было.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## З ПІКНІКА — У ШПІТАЛЬ

**Падчас адпачынку на прыродзе ўзарваўся газавы балон — трое дзяцей і жанчына атрымалі цяжкія апёкі.**



У панядзелак, 10 ліпеня, у 18.20 у цэнтр аператыўнага ўпраўлення Смаргонскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб тым, што паблізу вёскі Белая ўзарваўся газавы балон ёмістасцю 25 літраў. У выніку выбуху пацярпелі чатыры чалавекі, з іх трое дзяцей — дзве дзяўчынкі 2002 і 2004 гадоў нараджэння, хлопчык 2011 года нараджэння і яго маці 1988 года нараджэння. Усе яны атрымалі апёкі 1—3-й ступені.

Як аказалася, адпачыць на прыродзе прыехалі тры сям'і са Смаргонь, усяго сем чалавек. Раскінулі каля возера палатачны лагер, паставілі шэзлонгі. Непадалеку ўсталявалі газавы балон, але да гарэлкі і пліты не падключалі. Каля 17.15 адбыўся выбух.

— Балон знаходзіўся за тры метры ад палаткі, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталля ЖЫВАЛЕЎСКАЯ.** — Пры выбуху пацярпелі тыя, хто знаходзіўся ў радыусе чатырох метраў. Больш за іншых пацярпелі жанчына і 15-гадовая дзяўчына, якія атрымалі апёкі 50% цела. Двое іншых дзяцей — хлопчык і дзяўчынка — апёкі 25% цела. Пацярпелыя знаходзяцца ў аддзяленні рэанімацыі цэнтральнай раённай бальніцы.

Па словах прадстаўніка МНС, корпус балона нейк раптоўна разышоўся, быццам расшыўся, і выкід газавай сумесі загарэўся. Што магло выклікаць такі працэс, пакуль невядома. Балон будзе дасканала абследаваны. Праверку няшчаснага выпадку вядзе Следчы камітэт. У МНС кожныя 3—4 гадзіны фіксуюць стан пацярпелых. Пакуль ён ацэньваецца як стабільна цяжкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 18 июля 2017 года проводится внеочередное

**Общее собрание акционеров в заочной форме.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, 15.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

О наделении полномочиями.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 10 июля 2017 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 11 июля по 16 июля 2017 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 16 июля 2017 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8 (017) 229 64 10.

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь, УНП 100693551.

# ЗЛУЧАЮЧЫ ТЭХНАЛОГІІ



**Галоўны канструктар Аляксей ЯФРЭМАЎ прапаноўвае мабільны варыянт электразапраўкі.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тэхнапарк, які падтрымаў тады маладых дзівакоў, стаў для іх выратавальным кругам. Яны дагэтуль яму ўдзячны. Бо на той момант былі ўжо на грані адчаю. У іх паверылі і нават не звярталі ўвагі на тое, што ім не хапала грошай на арэнду. Толькі з часам кампанія стала на ногі і нават расшырылася.

## ЗНАХОДКА ДЛЯ БЕЛАЗА

СТРІМ па-ранейшаму рэзідэнт тэхнапарка, але даўно ўжо набыў самастойнасць. Цераз тры гады пасля стварэння кампаніі знайшоўся нарэшце той заказчык, які ў іх паверыў, — БелАЗ. «На прадпрыемстве працаваў выпускнік аднаго з нашых таварышаў — выкладчыка Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (БРУ). На БелАЗе на той момант існавала праблема з мадэліраваннем работы электрычнай трансмісіі. Мы прапанавалі яе вырашыць. Пасля звярнулі ўвагу на тое, што можам палепшыць сістэму кіравання самазвала. І нам зноў даверылі. У выніку сёння фактычна працэнтаў на 80 белазаўскія самазвалы сыходзяць з канвеера з нашымі падсістэмамі. У нас цяпер вельмі цесныя ўзаемаадносіны з БелАЗам, за час супрацоўніцтва з'явілася некалькі сумесных праектаў».

Гэта толькі на першы погляд здаецца, што рэалізаваць ідэю проста. Аўтар распрацоўкі сістэмы кіравання цягавым электрапрывадам для БелАЗа Андрэй Шваякоў расказвае, што пачынаў свой праект яшчэ шэсць гадоў таму. І толькі сёлета атрымалася запусціць у эксплуатацыю першую машыну. «Мы шмат эксперыментавалі на палігоне БелАЗа, — кажа ён. — Гэта была першая беларуская распрацоўка электрапрывада з асінхронным рухавіком. У канцы гэтага года плануем скончыць распрацоўку новага энергаэфектыўнага прывада. Яго беларускага аналага пакуль не існуе».

— Час пошукаў скончыўся, — кажа Сяргей Радкевіч. — Цяпер мы сябе выразна пазіцыянуем кампаніяй, якая працуе выключна на аўтамабільны рынак краіны. Наогул добра рабіць можна толькі адну рэч. Нельга быць прафесіяналам ва ўсім. Гэта як на вайне. Трэба засяродзіцца на кропцы ўдару і біць ў адну цэль. Наша кропка — аўтамабільная прамысловасць. І наша місія ў тым, каб самыя сучасныя тэхнічныя рашэнні прысутнічалі на беларускіх прадпрыемствах.

БелАЗ, МАЗ, МТЗ, Гомсельмаш, Амкадор, Магілёўтрансмаш, ЗКЦ, АўтаЛіда, Белкамунмаш — кампанія бярэцца за рашэнні іх тэхнічных праблем. Усе праекты вузкаспецыялізаваныя, робіцца выключна пад заказчыка. Толькі пасля таго як яны апрабаваліся і заказчык застаўся задаволены, СТРІМ стварае для яго серыйную прадукцыю.

Сёння перспектыўны кірунак — развіццё электратранспарту. І ў кампаніі тут таксама ёсць што прапанаваць. На яе тэрыторыі знаходзіцца зарадная станцыя для электрамабіля, зробленая па праекце галоўнага канструктара кампаніі Аляксея Яфрэмава. Ён жа ўладальнік аднаго з нямногіх пакуль што ў Магілёве электрамабіляў.

— Запраўка зроблена як даніна трэнду, — усміхаецца ён. — Увесь свет паступова адыходзіць ад рухавікоў унутранага згарання. У Еўропе, ЗША павялічваецца колькасць электразапраўак. У Беларусі іх можна пералічыць па пальцах. У Магілёве наогул адна — толькі ў нас.

Кампанія гатова зрабіць для горада роўна столькі электразапраўак, колькі трэба. Парадокс у тым, што заказаў пакуль няма. Але, напэўна, гэта справа часу. Бо не можа Магілёў заставацца ў баку ад новых павеваў. Тым больш што нядаўна атрымаў у падарунак ад кітайцаў два электробусы.

— Мы хацелі паставіць станцыю ў цэнтры горада, былі перамовы з уладамі, — кажа Аляксей. — На пачатковым этапе атрымалі дабро, а потым усё заглухла. Але патрэба ў такіх станцыях непазбежна. У краіне ёсць праграма па стымуляванні попыту і набыцці электрааўтамабіляў. Адзін з пунктаў — развіццё станцый для электрападзарадкі за кошт бюджэтных сродкаў, будаўніцтва іх на аўтамагістралях і ў гарадах.

Умоўна існуе тры тыпы такіх запраўак — блок зарадкі ад бартавой сеткі магутнасцю да 3 кВт, больш хуткі варыянт зарадкі да 20 кВт, які плануецца ўстанаўліваць у грамадскіх месцах, і станцыі зарадкі магутнасцю да 50 кВт для аўтамагістраляў, якія зараджаюць акумулятар за паўгадзіны. СТРІМ робіць станцыі для гарадскіх вуліц.



**Аўтар распрацоўкі сістэмы кіравання цягавым электрапрывадам для БелАЗа Андрэй ШВАЯКОЎ.**

— Я карыстаюся аўто пайтара года, але адразу ж стала зразумела, што дзесьці яшчэ трэба мець зарадную станцыю, акрамя той, што на рабоце, — адзначае галоўны канструктар. — Для магіляўчан, якія вырашаць перасесці на электрамабіль, на першым этапе будзе дастаткова ў горадзе дзвюх станцый. Да таго ж у нас ёсць варыянты на любы густ — для дома, напрыклад. Вешаеце ў гаражы гэты прыбор і зараджаеце.

На сёння распрацоўкай электразапраўак у краіне займаюцца ўсяго тры кампаніі — у Мінску, Віцебску і Магілёве. Гэтага дастаткова, каб забяспечыць Беларусь неабходным абсталяваннем, лічаць у СТРІМе. Незразумела толькі, чаго мы чакаем. Сёння ў свеце актыўна развіваецца электрааўтамабілебудаванне. Імкліва з'яўляюцца і электробусы, і электрагрузавікі.

## ТРЭБА БЫЦЬ АПАНТАНЫМ

У кабінеце Сяргея Радкевіча ёсць палічка з кнігамі, якія, як ён лічыць, павінен сёння мець кожны сучасны кіраўнік. «Гэта класіка менеджменту, — тлумачыць ён. — Свет вельмі хутка мяняецца, і тая метадалогія кіравання, якая існавала 20 гадоў таму, цяпер не працуе. Павелічэнне колькасці работнікаў інтэлектуальнай працы падняло пытанні ўнутранай культуры кампаніі, яе ўнутраных каштоўнасцяў на першы план. І калі кіраўніцтва не жадае разумець гэтую праблематыку, яго прадпрыемства асуджана на правал.

Праблемы, як прывабіць заказчыка, зараз для кампаніі не стаяць так востра, як раней. Ды і попыт на ўнікальныя праекты ў краіне ўжо іншы, чым 15 гадоў таму. СТРІМ сёння болей клапоціцца пра імідж, які трэба пастаянна падтрымліваць. А гэта не менш важна, чым знайсці заказчыка.

— Мне цяпер патрэбны памочнік, гэтакі эйчар, — разважае кіраўнік. — З ім было б працей праводзіць тыя змяненні, якія адбываюцца ў кампаніі. Калі спачатку яна мела больш тусовачны стыль, дзе ўсе свае людзі, то зараз, калі яна расце і прыходзяць новыя супрацоўнікі, цяжка бывае знайсці агульную мову. Любая кампанія — гэта працяг заснавальнікаў, а навічкі не заўсёды іх разумеюць. Мы спачатку глядзім, каб чалавек супадаў па духу, а пасля пераходзім да ацэнкі яго прафесійных навыкаў. Бо па складзе мыслення ён павінен быць яшчэ і тэхнар.

Да распрацовак праектаў СТРІМ прыцягвае ў тым ліку і адораных студэнтаў і аспірантаў БРУ. Некаторыя з іх тут праходзяць пераддыпломную практыку. На базе тэхнапарка другі год існуе сумесная з БРУ лабараторыя, дзе прадстаўнік кампаніі дапамагае студэнтам накіроўваць свае веды ў патрэбнае рэчышча. Для гэтага СТРІМ стварыў усе неабходныя ўмовы — абсталяваў памяшканне стэндамі і камп'ютарамі.



**Зарадка для электрааўто.**

— Праблема не столькі ў тым, што пачаткоўцам не хапае ведаў, многім проста нестае цікавасці, — дзеліцца набалелым Сяргей Радкевіч. — Хацелася б, каб студэнты былі больш захопленыя. Яшчэ Альберт Эйнштэйн казаў, што геній — гэта 1% таленту і 99% усёдлівасці. Цяперашняе пакаленне ганіцца за хуткім вынікам, а наша прафесія патрабуе ўседлівасці і захопленасці. Бывае, малады чалавек захоплены, але потым з тых ці іншых прычын гэта знікае, таму наша місія — такіх людзей падхопліваць і накіроўваць на мэту. Бо, калі мы жадаем узысці на Эверэст, у нас будуць разадраны рукі. Але ён усё ж такі пакорыцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ШТО НОВАГА Ў САЦЫЯЛЬНЫМ АБСЛУГОЎВАННІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мяркуецца, што аказанне такіх паслуг некаторым катэгорыям непрацаздольных грамадзян будзе выплатным.

Пры арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання ў замешчанай сям'і будзе заключацца трохбаковы дагавор. Бакамі такога дагавора будуць выступаць фізічная асоба, якая ўзяла на сябе абавязкі па доглядзе, непрацаздольны чалавек, якога даглядаюць, і тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, які будзе суправаджаць такую сям'ю.

На практыцы такая сацыяльная тэхналогія ў нашай краіне ўжо апрабавалася і існуе, адзначае Тацццяна Фёдарава. Цяпер яна замацавана і заканадаўча.

## Каб рынак сацыяльных паслуг развіваўся

Згодна з законам «Аб сацыяльным абслугоўванні», што быў прыняты ў новай рэдакцыі ў 2013 годзе, прадугледжана прыцягненне юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў. Гаворка ідзе аб дзяржаўным сацыяльным заказе, дзякуючы якому некамерцыйныя арганізацыі могуць прэтэндаваць на субсідыі дзяржавы ў гэтай сферы.

У гэта дазваляе прыцягнуць у сістэму сацабслугоўвання дадатковыя матэрыяльныя і чалавечыя рэсурсы і сфарміраваць рынак сацыяльных паслуг. Новым законам прадугледжана ўдасканаленне механізма дзяржаўнага сацыяльнага заказу, што павінна пашырыць кола ўдзельнікаў рынку сацыяльных паслуг і палепшыць іх якасць.

Так, дагавор паміж мясцовымі органамі ўлады і грамадскай або недзяржаўнай арганізацыяй, якая збіраецца працаваць у рамках дзяржаўнага сацыяльнага заказу, будзе заключацца на тэрмін да пяці гадоў. Да апошняга часу такія дагаворы заключаліся, як правіла, на адзін год, але заўважылі, што, пакуль пройдуць усе ўзгадненні, будуць выдзелены грошы, часу на аказанне сацыяльных паслуг звычайна застаецца не так ужо і шмат.

**Любая фізічная асоба пры жаданні зможа ўдзельнічаць у абслугоўванні пажылога чалавека ці інваліда (які павінен быць паўналетнім), але пры гэтым іх не павінны звязваць адносіны, якія абавязваюць законам утрымліваць дадзенага грамадзяніна.**

Яшчэ адна змена датычыцца сітуацыі, калі ў конкурсе на выкананне дзяржаўнага сацыяльнага заказу ўдзельнічала толькі адна арганізацыя. Цяпер, калі яна адпавядае ўсім неабходным патрабаванням, будзе лічыцца, што конкурс адбыўся. Такое змяненне вельмі актуальнае для раёнаў, дзе не так шмат недзяржаўных арганізацый, якія хацелі б удзельнічаць у падобных конкурсах.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны таксама адзначаюць, што цяпер мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы атрымалі паўнамоцтвы па пашырэнні пераліку аказаных дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання сацыяльных паслуг, а таксама катэгорый грамадзян, якія маюць права на іх атрыманне.

Законам замацавана і магчымасць аказання сацыяльных паслуг на падставе трохбаковага дагавора, які мы ўжо згадалі, расказваючы пра замешчаныя сем'і. Заканадаўчае замацаванне трохбаковага дагавора дазволіць членам сям'і, дзе ёсць, напрыклад, асобы з псіхічнымі захворваннямі, а таксама іншым фізічным і юрыдычным асобам выступаць трэцім бокам у дагаворы і аплачваць сацыяльныя паслугі, у тым ліку пры арганізацыі догляду ў псіханеўралагічных дамах-інтэрнатах на платнай аснове.

### Гэта важна

**Новы закон уступіць у сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання — 25 снежня гэтага года.**

**З 2018 года ў практыку работы ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання плануецца ўвесці стандарты якасці сацыяльных паслуг. Гэта пэўны набор патрабаванняў, выкананне якіх павысіць якасць аказання сацыяльных паслуг, якія ўваходзяць у пералік бясплатных і агульнадаступных.**

**У найбліжэйшы час Міністэрства працы і сацыяльнай абароны распрацуе Палажэнне аб сацыяльным абслугоўванні ў замешчанай сям'і і ўнясе змяненні ў пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, а таксама ў інструкцыю аб парадку і ўмовах аказання сацыяльных паслуг.**

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

12 ліпеня 2017 г.
№25 (409)




стар. 2

**Жанчыны за роўнасць магчымасцяў**



стар. 3

**Хто развяжа «Гардзееў» вузел?**



стар. 6

**Чаму забаронены беларускія Мальдывы?**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ЗЯМЛЯ Ў РЭЖЫМЕ ЧАКАННЯ



Фота БЕЛТА.

**ЯШЧЭ некалькі гадоў таму ў гарачае надвор'е на ўскрайку маёй роднай вёскі перыядычна можна было назіраць дымавую заслону. Такім чынам ці то мясцовыя жыхары, ці то сама прырода «дапамагалі» пазбавіцца ад смецця на размешчаным там міні-палігоне цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). Сёння ж пажараў, ды і ўвогуле бытавых адходаў там не ўбачыш — міні-палігон рэкультывавалі, а ў вёсцы ўстанавілі спецыялізаваныя кантэйнеры...**

**Але сотні такіх «складоў» да гэтага часу адкрытыя па ўсёй краіне — яны, не толькі займаюць значную плошчу, але і з'яўляюцца патэнцыйнымі забруджвальнікамі навакольнага асяроддзя. Як вырашаецца праблема палігонаў і выпрацаваных кар'ераў карысных выкапняў і калі гэтыя аб'екты знікнуць з карты Беларусі, расказалі спецыялісты.**

стар. 4—5

КАДРАВАЕ ПЫТАННЕ

# БАЛЬНІЦА Ў СПАДЧЫНУ

**З медыкамі Доўскай бальніцы Рагачоўскага раёна разважаем пра тое, як маладога спецыяліста «зачапіць» за вёску. А яшчэ пра тое, як трэба вырашаць дэмаграфічныя праблемы і ставіцца да павышанага ціску**

**Галоўнаму ўрачу Наталлі Гаўрушцы бальніца дасталася, можна лічыць, у спадчыну. Яе маці Леакадзія Вітольдаўна Путрык у свой час перадала справы дачцэ. Дарэчы, і бацька Наталлі Яўгенаўны — Яўген Мікалаевіч — адпрацаваў тут хірургам з моманту размеркавання. Дынастыя вясковых урачоў заўсёды ганарылася месцам жыцця і працы. І на сваім прыкладзе пераконвала, што жыццё ў глыбінцы мае шмат пераваг.**

**Між тым сённяшні кіраўнік установы ўспамінае, з чаго пачыналася яе захапленне медыцынай:**

— Бацька ў мяне з Мінскай вобласці, а мама — з Гродзенскай. Па размеркаванні разам са мной, двухгадовай, яны прыехалі сюды, таму што бацька катэгарычна хацеў быць толькі хірургам. А тут знайшлося месца для яго. Калі ў мяне пытаюць, колькі гадоў я на гэтым месцы працую, — адказваю, што ўсё жыццё. Памятаю невялічкую драўляную бальніцу, якая знаходзілася за царквой. У канцы калідора была аперацыйная, дзе пад звычайнымі лямпамі хірургі праводзілі складаныя аперацыі... Падзеяй для Доўска заўсёды лічыўся прылёт верталёта санавіяцыі — калі ўсё ж трэба было пацыента накіроўваць у Гомель. Усе дзеці беглі ў поле і глядзелі, як з верталёта выходзілі санітары ў белых халатах з насілкамі, каб транспартаваць цяжка хворых. А калі маці вяла прыём у амбулаторыі, я адчыняла дзверы і запрашала: «Наступны!» У кабінеце бацькі стаялі невялічкія флакончыкі, у якіх знаходзіліся выдаленыя апендыцыты. Для мяне была казка іх разглядаць і распытваць: «А чаму яны рознага колеру?» Для мяне гэта была звычайная справа.

стар. 8



Галоўны ўрач Доўскай бальніцы Наталля Гаўрушка вымярае ціск пацыентцы паліятыўнага аддзялення.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ

### Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у сесіі ПА АБСЕ

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, і Мар'яна ШЧОТКІНА, віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента, а таксама члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у рабоце 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая праходзіла з 5 па 9 ліпеня ў Мінску.**




У рамках мерапрыемства, прысвечанага ўмацаванню ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і росквіту ў рэгіёне, прайшлі пасяджэнні пастаяннага камітэта ПА АБСЕ і агульных камітэтаў: па палітычных пытаннях і бяспецы; па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі; па дэмакратыі, правах чалавека і гуманітарных пытаннях. Члены Савета Рэспублікі таксама ўзялі ўдзел у названых пасяджэннях.

## КАМФОРТНЫЯ ЎМОВЫ — БУЙНЫЯ ПРАЕКТЫ

### Спікер верхняй палаты сустрэўся з заснавальнікам індыйскай фармацэўтычнай карпарацыі

**Для беларуска-індыйскага фармацэўтычнага праекта будуць створаны самыя лепшыя ўмовы. Аб гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з заснавальнікам і старшынёй савета дырэктараў групы кампаній ХЕТЭРА Бандзі Партхасардхі Рэддзі.**

— Сёння мы рэалізуем тры праекты з індыйскімі фармацэўтычнымі кампаніямі, але сумесны з вашай карпарацыяй праект па стварэнні ў Каляздічах вытворчасці антырэтравірусных прэпаратаў і прэпаратаў агульнатэрапеўтычнага прызначэння — самы буйны, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Па словах старшыні Савета Рэспублікі, каштарысная вартасць прадпрыемства складае каля $60 млн, на ім запланавана рэалізаваць тры лініі.

«Таму мы будзем ствараць неабходныя камфортныя ўмовы, — дадаў Міхаіл Мясніковіч. — І мы хацелі б выраблядь у партнёрстве з індыйскімі інвестарамі больш найменняў лекавых формаў». Ён таксама дадаў, што спадзяецца на працяг беларуска-індыйскага супрацоўніцтва, якое можа развівацца ў новых сумесных праектах.

## ДАРОГІ ПАД НАГЛЯДАМ

### Абмеркавалі пытанні інфраструктурнай стратэгіі

**Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, узяў удзел у чарговым пасяджэнні Міжведамаснага інфраструктурнага каардынацыйнага савета (МІКС), членам якога ён з'яўляецца.**

У ходзе мерапрыемства была заслухана справаздача аб дзейнасці МІКС за мінулы год і першую палову 2017-га, а таксама абмяркоўваліся пытанні актуалізацыі Нацыянальнай інфраструктурнай стратэгіі, папярэдні вынікі падрыхтоўкі праекта дзяржаўна-прыватнага партнёрства па рэканструкцыі ўчастка аўтадарогі М-10, план мерапрыемстваў па развіцці дзяржаўна-прыватнага партнёрства на 2017—2018 гады.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# «НАМ УСІМ НЕАБХОДНЫ БАЛАНС»

**Рабочы ланч, прысвечаны гендарным пытанням, прайшоў падчас 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Усім прысутным прапанавалі абмеркаваць, якія канкрэтныя крокі могуць быць зроблены ў справе садзейнічання лідарству жанчын у палітычных працэсах і структурах.**

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА** адзначыла, што дасягненне гендарнай роўнасці — гэта пятая мэта ААН у галіне ўстойлівага развіцця. І Беларусь разам з АБСЕ зладжана працуе па гэтым напрамку. У краіне дзейнічае план, зацверджаны Саветам Міністраў, па дасягненні гендарнай роўнасці, разлічаны да 2020 года. Летась упершыню быў прыняты план па правах чалавека, дзе таксама ўключаны пэўныя пункты па гэтым пытанні.

«Праблемы, якія існуюць абсалютна ва ўсіх краінах, — гэта прафесійная сегрэгацыя, разрыў у аплаце працы», — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна. У Беларусі разрыў складае каля 23%. Пры гэтым доля жанчын у парламенце звыш 33%, сярод дзяржаўных служачых — да 70%, кіраўнікоў — каля 55%, у судзейнай уладзе — 65%.

У гэтым вялікая роля парламентарыяў, таму што заканадаўства павінна ўлічваць гендарныя аспекты. Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што мэта жаночага руху — гэта заўсёды мір, стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.



Фота Надзеі БУЖАН.

Злева направа: Мар'яна ШЧОТКІНА, Крысцін МУТАНЕН, Людміла МАКАРЫНА-КІБАК, Ірына КАСЦЕВІЧ.

**Старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ Крысцін МУТАНЕН,** дарэчы, першая жанчына, якая заняла гэтую пасаду. Яна лічыць, што ў Беларусі жывуць і працуюць вельмі моцныя жанчыны. «Нам усім неабходны баланс паміж мужчынамі і жанчынамі ва ўладзе. І мы сабраліся тут, каб абмеркаваць, як нам прыйсці да яго», — адзначыла Крысцін Мутанен. На яе думку, нягледзячы на розныя сітуацыі ў дзяржавах, жанчыны пакутуюць больш за ўсіх. Існуюць роўныя магчымасці ў адукацыі і працаўладкаванні, але ёсць «шкляная столь», вышэй за якую жанчына падняцца не можа. Менавіта таму неабходна працаваць разам, каб жанчыны знаходзіліся за сталом перагавораў і мелі магчымасць сказаць сваё слова. Крысцін Мутанен дадала, што ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ таксама імкнуцца да гендарнага балансу, але пакуль яго цалкам дасягнуць не атрымалася.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ірына КАСЦЕВІЧ** звярнула ўвагу на тое, што ў краіне сёння дзейнічае Нацыянальны савет па гендарнай палітыцы. Дарэчы, у Беларусі 53% насельніцтва — жанчыны.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

АБМЕРКАВАННЕ

# ЖАНЧЫНЫ СУПРАЦЬ!

**Сёння Рэспубліка Беларусь не з'яўляецца самай пітушчай краінай у свеце. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, лідар па гэтым паказчыку — Літва з 16 літрамі алкаголю на душу насельніцтва. Аднак мы сышлі не так далёка: з 15 літрамі алкагольных напояў на грамадзяніна Беларусь заняла зусім не ганаровае другое месца. Чаму беларусы так шмат п'юць? Як з гэтым змагацца? Як перамагчы не менш страшную хваробу — наркаманію? Гэтыя пытанні на круглым стале на тэму «Жанчыны супраць п'янства і наркотыкаў» абмеркавалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Сустрэча прайшла на базе Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя — наркаманія».**

— У сучасным грамадстве ўжо шмат дзесяцігоддзяў ідзе барацьба з такімі сацыяльнымі праблемамі, як алкагалізм і наркаманія, — адзначыла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Вольга ПЕТРАШОВА.** — І рашэннем гэтай праблемы разам з медыцынскімі і сацыяльнымі работнікамі займаюцца дзяржава ў цэлым, грамадзянская супольнасць і розныя грамадскія інстытуты.

— На наркалагічным уліку ў Рэспубліцы Беларусь знаходзіцца каля 3% насельніцтва — і гэта толькі па алкаголі. Пры гэтым паказчык разлічваўся з улікам нованароджаных, бабуль і дзядуль, — падкрэсліла **галоўны ўрач Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя — наркалогія»**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Людміла АНДРЭЕВА.** — Калі разлічваць яго толькі адносна мужчынскага насельніцтва краіны, то атрымаецца ўжо 8%. А калі казаць пра сельскую мясцовасць, то там каля 14% працаздольных мужчын ва ўзросце ад 20 да 39 гадоў, а таксама каля 4% жанчын знаходзіцца на наркалагічным уліку.

Не менш сур'ёзнай праблемай Людміла Андрэева называе і наркотыкі, якія сёння па сваім хімічным саставе сталі досыць разнастайнымі. Гэта прывяло да таго, што наркатычная залежнасць у людзей стала фарміравацца значна хутчэй. «Ужо з першага або другога ўжывання ў чалавека пачынаецца прывыканне», — дадала галоўны ўрач.

Адкуль узнікаюць гэтыя праблемы? На думку многіх удзельнікаў круглага стала, усё пачынаецца з сям'і. Калі бацькі здолеюць прывіць свайму дзіцяці культуру піцця, будуць гаварыць аб негатыўных наступствах залежнасці як алкагольнай, так і наркатычнай, то правільнае стаўленне да гэтых пытанняў абавязкова сфарміруецца. Акрамя таго, у школы перыяд пастаянны кантакт з вучнямі па гэтых пытаннях абавязаны трымаць і настаўнікі, і школьныя псіхолагі, упэўнены ўдзельнікі круглага стала.

Як перамагчы гэтыя цяжкасці? На думку Вольгі Петрашовай, менавіта эфектыўная прафілактыка, прапаганда здаровага ладу жыцця, наглядныя прыклады сацыяльных і медыцынскіх наступстваў спажывання алкаголю і наркотыкаў дапамогуць пераадолець гэтыя вельмі складаныя праблемы.

Абмежаванне продажу алкаголю толькі ў пэўны час не вырашыць праблему, упэўнена **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Ала СОПІКАВА.** «На пэўна, ёсць нейкі працэнт людзей, якім раптам сярод ночы захацелася купіць алкаголь. Але звычайна, калі ўжо чалавек плануе гэтай справай заняцца, то ён можа ўсё гэта купіць і загадзя, — лічыць дэпутат. — І такія строгія меры не заўсёды прыводзяць да жаданага выніку». Парламентарый таксама нагадала, што ў часы так званага сухога закона нават на безалкагольных вяселлях «у чайніку разлівалі спіртное».

Але ў выпадку з наркотыкамі абмежаванні распаўсюджвання неабходныя, лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Людміла МАКАРЫНА-КІБАК.** «Мы абмежавалі распаўсюджванне псіхаактыўных рэчываў, — падкрэсліла яна. — І я лічу, што менавіта пры шматфактарным аналізе і актыўнай рабоце мы атрымаем пазітыўны вынік».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# УМЕЦЬ СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ

**У Бараўлянскім сельсавеце востра стаіць праблема недахопу месцаў у дзіцячых садках: сваёй чаргі чакаюць каля чатырох тысяч малых. У 2014 годзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне Мінаблвыканкаму і Мінгарвыканкаму пабудаваць дзве дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Абласныя ўлады з задачай справіліся: у вёсцы Лескаўка летась пабудавалі і адкрылі садок. А вось Мінскі гарвыканкам сутыкнуўся з праблемай выбару месца: знайсці яго ў Бараўлянах практычна немагчыма з-за шчыльнай забудовы. Пытаннем займаліся адпаведныя службы і спецыялісты. Высветлілася, што пад дзіцячы садок з адпаведнай інфраструктурай неабходна пяць гектараў зямлі. Падабралі два ўчасткі: у лесе і на землях сельскагаспадарчага прызначэння. Прыярытэт аддалі першай пляцоўцы. Вядома, папярэдне ўлады ўзгаднілі сваё рашэнне з кіраўніком дзяржавы і атрымалі дазвол.**

Але рашэнне будаваць садок у лесе абурыла мясцовых жыхароў, якія сабраліся ў Доме культуры для абмеркавання карэкціроўкі генеральнага плана развіцця Бараўлян і аграгарадка Лясны да 2030 года. У зале не было дзе яблыку ўпасці. Людзі стаялі нават у праходах паміж крэсламі. Усе яны аднаназначна выказаліся супраць высечкі лесу і патрабавалі адмяніць карэкціроўку плана. Падтрымала прысутных і дэпутат Бараўлянскага сельскага Савета Ларыса Грыбалёва, якая з трыма дзецьмі жыве ў пасёлку. Яна расказала, што даведалася аб карэкціроўцы генплана выпадкова. Зрэшты, як і ўсе астатнія жыхары. Па словах Ларысы Грыбалёвай, аб гэтым не былі праінфармаваны і органы мясцовага самакіравання, таму яна мае намер паставіць пытанне на сесіі дэпутатаў мясцовага Савета.

Разам з тым намеснік старшыні Мінскага райвыканкама Ірына Савіцкая канстатавала, што высечка будзе весціся выбарачна, каб максімальна захаваць лес для малых.



Фота БЕЛТА.

Акрамя таго, за кожнае ссечанае дрэва будуць пасаджаныя тры маладыя. На думку прадстаўніцы райвыканкама, менавіта гэтая пляцоўка найлепш падыходзіць для дзіцячага садка. «Не ставіць жа будынак пасярод голага поля, каб дзеці дыхалі пылам і пяском», — лічыць яна.

Яшчэ адна кропка сутыкнення інтарэсаў улад і жыхароў Бараўлян — чатырохпалосная аўтадарога, якая пазначана на плане і якая ў будучым дасць магчымасць трапіць у суседнія населеныя пункты не па аб'язной дарозе, а напрамую. Да яе ўладкавання мяркуецца прыступіць у 2030 годзе. Але ўжо цяпер уладальнікаў прыватнага сектара палохае перспектыва (як яны сцвярджаюць самі) зносу 34 дамоў, рэканструкцыі 280 дамоў, значнае ўшчыльненне індывідуальнай забудовы.

— Дарога была запланавана і ў генпланах развіцця 1988, 1994 і 2008 гадоў, — растлумачыў галоўны інжынер Інстытута «Белжылпраект» Валерый Ляўковіч.

Але спецыялісту запярэчылі: пра гэта ніхто не ведаў! На што атрымалі адказ:

## Ці ўдасца дамовіцца ўладам і жыхарам Бараўлянскага сельсавета?

— Вы куплялі свае ўчасткі пад будаўніцтва ў 1994-м. І мелі законнае права азнаёміцца з дакументам і ўпэўніцца, што там мяркуецца праклaсці дарогу.

У сваю чаргу прадстаўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута «Горадабудаўніцтва» канстатаваў, што аб тым, ці знясуць гэтыя дамы, дакладна будзе вядома пасля распрацоўкі плана дэталёвай планіроўкі і будаўнічага праекта. Толькі тады будзе бачна, у каго і колькі метраў зямлі, магчыма, забяруць, а дзе можна «павярнуць» магістраль у абыход участка. Прычым, калі жыхары вырашаць, што ім хопіць і двухпалоснай дарогі, то іх меркаванне ўлічаць.

Галоўны архітэктар Мінскай вобласці Вадзім Нікалаенка прапанаваў прадоўжыць грамадскія слуханні і над канчатковым варыянтам папрацаваць разам з ініцыятыўнай групай. Мясцовыя жыхары аб'ядналіся ў суполку, якая налічвае, па словах арганізатараў, больш як 500 чалавек. Іх мэта — дабівацца перагляду праекта і адсочваць існуючы стан тэрыторый з удзелам прадстаўнікоў грамадскасці.

Дык усё ж ці атрымаўся дыялог паміж двума бакамі? Цяжка сказаць. Тыя аргументы, якія прыводзілі мясцовым жыхарам спецыялісты і прадстаўнікі ўлады, людзей не задавальнялі. Часам спецыялістам і ўладам проста не давалі выказацца, давесці сваю пазіцыю, растлумачыць сітуацыю. Залу захліснулі эмоцыі: паўсюль стаяў шум, лямант. Адзін з прысутных нават запатрабаваў, каб слуханні правялі на плошчы, паколькі яму ў зале не хапае паветра... На маю думку, такія паводзіны не здольны прывесці да канструктыўных рашэнняў. Перш за ўсё трэба ўмець слухаць і чуць іншых. І паважаць чужое меркаванне, калі яно нават не супадае з тваім.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# «ГАРДЗЕЕЎ» ВУЗЕЛ

## Да праблемы добраўпарадкавання вуліцы Краснадарскай у Магілёве «МС» вымушана звяртацца за апошнія два гады ўжо трэці раз



На Краснадарскай больш за ўсё баяцца дажджоў, бо вуліца ператвараецца ў глінянае балота.

**Старшыня вулічкама Віталь ГАРДЗЕЕЎ да апошняга адкладваў нашу сустрэчу. Кажа, спадзяваўся, што праблема вырашыцца. Але пасля таго, як на свята горада жыхары вымушаны былі з-за дажджу ісці ў цэлафанавых пакетах, замацаваных паверх абутку, страціў усякае цярпенне. У той дзень ён шмат чаго выслухаў ад незадаволеных суседзяў. «Вельмі справядлівыя словы, — дзеліцца Гардзееў набалелым. — Людзей можна зразумець. Яны ўжо другі год ходзяць па гліне, а камунальнікам да гэтага ніякай справы».**

### НА ШТО СКАРДЗІМСЯ?

Першы раз «МС» пісала пра дарожныя праблемы жыхароў раёна Чапаеўка летась першага чэрвеня. Нагадаем сутнасць скаргі. Карэспандэнт пабывала на месцы і разам са старшынёй вулічкама прайшлася па рабрыстай, як пральная дошка, вуліцы Краснадарскай, пабачыла ямы на вуліцы Валгаградскай, выслухала абурэнні жыхароў... Дарэчы, калісьці да дарогі па вуліцы Краснадарскай наогул не мелася прэтэнзій. Была добрая грунтовая дарога, якую час ад часу прафілявалі. Усё змянілася, калі адна фірма ўзялася за будаўніцтва тут каналізацыі. Работы праводзіліся за грошы жыхароў. Людзі разлічыліся з фірмай загадзя і хутка вельмі пашкадавалі. Бо будаўнікі не палічылі патрэбным прывесці ўсё пасля сябе ў першапачатковы выгляд.

— Гліну, выцягнутую падчас работ з глыбіні на паверхню, яны раскаталі па дарозе і прысыпалі невялікім слоем рачнога пяску, — кажа Віталь Гардзееў. — Пясок ужо даўно размыты, засталася адна гліна. Пакуль суха, усё нармальна, але як толькі пайшоў дождж, — хоць плач. Гразі па калена.

Былі спадзяванні, што публікацыя ў дзяржаўнай газеце прымусіць прыняць нейкія меры і навесці парадак на Краснадарскай. Праз чатыры месяцы, у кастрычніку, калі зноў палілі дажджы, Віталь Гардзееў запрасіў карэспандэнта ў госці яшчэ раз. Каб паказаць, што нічога не змянілася.

Генеральны дырэктар Магілёўскага гарадскога ўпраўлення камунальных прадпрыемстваў (УКП) Андрэй Кіблоў тады паведаміў, што комплексным планам добраўпарадкавання на 2016 год прадугледжана падсыпка шэрагу вуліц, у тым ліку і Валгаградскай, асфальтагранулятам з вуліцы Мінская шаша, дзе на той час ішла рэканструкцыя. Ён таксама паабяцаў, што будуць прыняты меры і па вуліцы Краснадарскай. Вось яго словы: «Мы накіравалі ліст у фірму, якая рабіла земляныя работы, з патрабаваннем прывесці ў адпаведнасць месца раскопак. Калі гэтага не будзе зроблена, фірма можа пазбавіцца дазволу на раскопкі, пакуль не ліквідуе недахопы».

Прайшло ўжо восем месяцаў, але ўсё застаецца па-ранейшаму.

### ХАДЖЭННЕ ПА ПАКУТАХ

За два гады, што цягнецца гэта праблема, Віталь Гардзееў паспеў сабраць цэлую папку дакументаў. Перапіска з рознымі інстанцыямі, фотаздымкі з участкамі злашчасных вуліц — гэтага так шмат, што хопіць калі не на дарожны раман, то на аповесць дакладна. Старшыня вулічкама сцвярджае, што апошнім часам адказныя за стан вуліц асобы сталі яго ігнараваць або казаць, што нічога яму не абяцаў.



Віталь Гардзееў сабраў цэлае дасье па «дарожнай» справе.

— Два гады таму дзве ямкі засыпалі на вуліцы Валгаградскай і на гэтым іх праца скончылася, — абураецца Віталь Фёдаравіч. — Далі адпіску, што на вуліцу Валгаградскую патрацілі 98 тон асфальтагранулята. Дзе яны? Намеснік генеральнага дырэктара УКП спасылаецца на тое, што Дзяржнагляд прыняў гэтую дарогу. Але яе нельга было прымаць, бо яна амаль не змянілася. Няўжо нельга зрабіць так, каб і самім было спакойна на душы, і людзям не трэба было пакутаваць? Месяц таму зрабіў заяўку, каб падраўнялі вуліцы Беларускую, Львоўскую, Філатава, але дагэтуль нічога не зроблена. Кожны дзень тэлефаную ў дарожна-маставое прадпрыемства — нуль увагі.

### ДАРОГУ ПАВІННЫ АДНАВІЦЬ... ЖЫХАРЫ?

— Вось прыслалі нядаўна яшчэ адзін ліст з упраўлення камунальных прадпрыемстваў, — дэманструе Віталь Гардзееў афіцыйны дакумент. — Там гаворыцца, што ў мэтах праезду па вуліцы Краснадарскай абяцаем зрабіць дарогу ў 3-м квартале 2017 года. Але я ім ужо не веру. Вельмі баюся, што падмануць.

«МС» звярнулася ва ўпраўленне камунальных прадпрыемстваў Магілёва, каб высветліць, колькі яшчэ чакаць жыхарам рашэння іх праблемы. Па словах **першага намесніка генеральнага дырэктара УКП Аляксандра БУРАЧКОВА,** прафіляванне вуліцы Краснадарскай з падсыпкай асфальтагранулята будзе выканана ў трэцім квартале гэтага года. Спецыяліст адзначыў таксама, што прафіляванне грунтовых вуліц у горадзе пастаянна праводзіцца 1—2 разы на год. Што датычыцца асфальтавання вуліц Валгаградская і Краснадарская, то сёлета гэта не плануецца.

— Мы працуем згодна з тымі планамі, якія зацверджаны гарвыканкамам, і ў межах таго фінансавання, якое выдзяляецца, — паведаміў Аляксандр Бурачкоў. — Робіцца ўсё, каб не было крытычнага стану дарог і забяспечваўся праезд. Пры гэтым перавага аддаецца тым дарогам, дзе курсіруе грамадскі транспарт. У далёкіх планах усю дарожную сетку горада прывесці ў ідэальны стан, хоць разумеем, як гэта складана.

А вось наконт дзейнняў арганізацыі, якая ператварыла вуліцу Краснадарскую ў гліняную, спецыяліст растлумачыў, што «яна тут ні пры чым». Што былі двухбаковыя дагаворы паміж жыхарамі вуліцы і арганізацыяй на пракладку каналізацыі, згодна з якімі добраўпарадкаванне Краснадарскай павінна было адбыцца за кошт... жыхароў. Стан грунтовага пакрыцця на вуліцы Краснадарскай, па словах першага намесніка генеральнага дырэктара УКП, здавальняючы, пра што сведчыць падпісаны УКП 27 мая 2016 года акт прынятых работ. І дарога зараз пяць гадоў павінна знаходзіцца на гарантыі. Трэба разумець, што на гарантыі... жыхароў вуліцы? Магчыма, пры падпісанні дагавора людзі проста не цалкам вывучылі свае абавязкі. Цяпер вось маюць праблемы. Дзіўна і тое, што камунальнае прадпрыемства не пракантралявала гэты, мякка кажучы, не зусім карэктны дагавор. Бо падрадчык перакапаў усю вуліцу, а не кавалачак ад канкрэтнага дома да дарогі.

Як растлумачыў Аляксандр Бурачкоў, на сённяшні дзень усе дагаворы на раскопкі даюцца юрыдычным асобам з умовай, што менавіта яны, як падрадчыкі, павінны адказваць за тое добраўпарадкаванне, якое павінна быць зроблена пасля земляных работ. А вось жыхарам вуліцы Краснадарскай, напэўна, проста не пашчасціла. Але, паабяцала адказная асоба, будзе рабіцца ўсё магчымае, каб дапамагчы жыхарам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

# ЗЯМЛЯ Ў РЭЖЫМЕ

### АСНОЎНЫЯ ПАРУШЭННІ Ў СФЕРЫ РАСПРАЦОЎКІ КАР'ЕРАЎ:

• здабыча карысных выкапняў без прававых падстаў (напрыклад, здабыча па-за межамі прадстаўленага горнага адводу);

• парушэнне патрабаванняў рацыянальнага выкарыстання нетраў (выбарачнае выманне карысных выкапняў);

• парушэнне патрабаванняў па рэкультывацыі выпрацаваных кар'ераў (нясвоечасовая, а таксама неадпаведная тэхнічным нормам);

• незахаванне дазволенай глыбіні здабычы карысных выкапняў на ўнутрыгаспадарчых кар'ерах;

• парушэнне парадку здымання і захавання ўрадлівага пласта глебы і інш.

Згодна з беларускім заканадаўствам, у асноўным нетракарыстальнікі нясуць адказнасць за парушэнне патрабаванняў па выкарыстанні нетраў і парушэнне правілаў аховы нетраў. Максімальны памер штрафаў — 500 базавых велічынь.

Фізічныя асобы — парушальнікі заканадаўства аб абыходжанні з адходамі нясуць адказнасць згодна з арт. 15.63. ч. 2 (папярэджанне ці накладанне штрафу ў памеры ад 5 да 50 базавых велічынь).

**У 2016 годзе 327 унутрыгаспадарчых кар'ераў з 1293 не адпавядалі крытэрыям навядзення парадку на зямлі. Сёння ў краіне не распрацоўваецца 98 кар'ераў карысных выкапняў.**

### ЗАХОЎВАЦЬ ЦІ ВЫМАЦЬ?

У большасці выпадкаў у працэсе рэкультывацыі адходы застаюцца ў зямлі назаўсёды. А гэта — патэнцыйная небяспека для навакольнага асяроддзя. Некаторыя міні-палігоны, асабліва ўтвораныя некалькі дзесяцігоддзяў таму, утрымліваюць у сваім «целе» шкодныя рэчывы, якія могуць трапіць у прыроду. І калі на буйных аб'ектах па захаванні адходаў робяцца свідравіны для маніторынгу і ўзводзяцца ахоўныя збудаванні, то міні-палігоны такога «абсталявання» не маюць.

Праблема магла б вырашыцца, калі б перад рэкультывацыяй адходы выдаляліся з палігона. Сёння некаторыя інвестары прапаноўваюць рэалізоўваць такія праекты, у тым ліку не толькі на адкрытых аб'ектах, але і выведзеных з эксплуатацыі. Але пакуль усе яны знаходзяцца пад пільным разглядам — важна не толькі выняць адходы, але правільна іх выкарыстаць, не наносячы больш шкоды навакольнаму асяроддзю. Магчыма, пры аптымізацыі сеткі палігонаў частка смецця будзе перавезена на тыя палігоны, якія больш адпавядаюць экалагічным нормам.

### ПАЛІГОНЫ... НА КАРЦЕ

Мінпрыроды ў межах узаемадзеяння з Дзяржкаммаёмасцю абмяркоўвае пытанне аб уключэнні ў зямельныя інфармацыйныя сістэмы каардынат дзеючых аб'ектаў захавання адходаў і кароткую інфармацыю пра іх. Магчыма, на карце таксама з'явяцца і выведзеныя з эксплуатацыі, і рэкультываваныя палігоны.

— Гэта інфармацыя будзе карыснай пры правядзенні экалагічнай экспертызы праектаў, а таксама дапаможа сачыць за аб'ектамі захавання адходаў і пасля рэкультывацыі, — адзначыў Руслан Міхалевіч.

Сёння ў краіне існуюць распрацоўкі, якія з дапамогай спадарожніка дазваляюць кантраляваць аб'ём здабычы карысных выкапняў на розных аб'ектах і выяўляць несанкцыянаваныя звалкі і кар'еры.



## Калі смецця зашмат

Штогод у нашай краіне ўтвараецца каля 50 млн тон адходаў вытворчасці і каля 4 млн тон камунальных адходаў. Пакуль што большая частка апошніх (каля 80%) размяшчаецца на 168 палігонах і 1456 міні-палігонах ЦКА.

Па словах **начальніка ўпраўлення абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Руслана МІХАЛЕВІЧА,** захаванне — самы танны спосаб абыходжання з адходамі, але ж апошні па прыярытэтнасці — пасля выкарыстання, перапрацоўкі, абясшкоджвання.

Магчыма, невысокім узроўнем затрат і кіраваліся спецыялісты некалькі дзясяткаў гадоў таму, калі па ўсёй краіне масава пачалі ствараць міні-палігоны (у 2009 годзе колькасць такіх аб'ектаў дасягала 3903).

— Пры гэтым яны, у адрозненне ад буйных аб'ектаў захавання адходаў, амаль не адпавядаюць сучасным экалагічным патрабаванням, — расказаў **начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Арцём ШКРЫЛЬ.** — Сёння большасць міні-палігонаў вычарпалі свой рэсурс і маюць горшыя характарыстыкі па кантролі. Але поўнасцю адмовіцца ад іх выкарыстання пакуль немагчыма.

## І пясок любіць падлік

Распрацоўка кар'ераў — асноўны спосаб здабычы карысных выкапняў. Адкрытым спосабам, калі ў паверхні зямлі ўтвараюцца вялікія поласці, вымаюцца ў асноўным будаўнічыя матэрыялы: пяскі, пясчана-жвіровыя сумесі, гліны, торф, мелавыя пароды і інш. Сёння ў Беларусі так распрацоўваецца каля 500 радовішчаў, пры гэтым на многіх з іх дзейнічаюць па некалькі кар'ераў адначасова.

— Акрамя радовішчаў карысных выкапняў, якія служаць асновай для стварэння вытворчасцяў, асобныя гаспадаркі могуць распрацоўваць так званыя ўнутрыгаспадарчыя кар'еры для асабістых патрэб, — расказаў **начальнік упраўлення па геалогіі Мінпрыроды Сяргей МАМЧЫК.** — На тэрыторыі краіны іх налічваецца каля 1,3 тыс. Такія аб'екты звычайна выкарыстоўваюцца невялікі перыяд часу і для правядзення нескладаных будаўнічых работ.

> Удасканаленне заканадаўчай базы — важны этап работы ў сферы абыходжання з адходамі. Нормы дакументаў павінны быць празрыстымі і зразумелымі для ўсіх удзельнікаў працэсу

Важным адрозненнем прамысловых і ўнутрыгаспадарчых кар'ераў з'яўляецца тое, што для першых увесь працэс распрацоўкі рэгламентаваны заканадаўствам. Таму праблемы, звязаныя з імі, вырашыць значна лягчэй. Але і яны часам становяцца галаўным болем дзяржавы з-за нядбайных гаспадароў.

Напрыклад, калі глiністая сыравіна перастала карыстацца высокім попытам, многія прадпрыемствы, што здабывалі яе, закрыліся, а кар'еры гліны засталіся без гаспадароў, — яны поўнасцю не выпрацавалі свой рэсурс...

Што датычыцца ўнутрыгаспадарчых кар'ераў, то, па словах Сяргея Мамчыка, у беларускім заканадаўстве дакладна не прапісаны парадак іх распрацоўкі — толькі агульныя патрабаванні па прытрымліванні прыродаахоўнага заканадаўства і правілаў рэкультывацыі. Напрыклад: глыбіня такога кар'ера павінна не перавышаць пяці метраў; пасля выкарыстання і правядзення рэкультывацыі былыя сельскагаспадарчыя землі неабходна вярнуць у сельскагаспадарчы абарот і г. д.

— На практыцы ж мы бачым, што не ўсе разумеюць, як правільна здабываць агульнараспаўсюджаныя карысныя выкапні, — адзначыў Сяргей Мамчык. — Стварыўшы адзін кар'ер і не распрацаваўшы ўсе яго запасы, некаторыя арганізацыі пачынаюць адкрываць другі, што недапушчальна. Часта не выконваецца патрабаванні аб бяспецы, і на незакрытых кар'ерах, асабліва залітых вадой, гінуць дзеці.

## Новая глеба

Каб запоўненыя палігоны і выпрацаваныя кар'еры зніклі з карты Беларусі, патрэбна іх рэкультываваць. Работа ў гэтым кірунку трэці год запар праводзіцца ў межах Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі. Фінансавыя сродкі выдзяляюцца з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, прыцягваюцца сродкі і ўласнікаў аб'ектаў. Так, летась у краіне было выведзена з эксплуатацыі і рэкультывавана 294 міні-палігона і 183 унутрыгаспадарчыя кар'еры, а сёлета ў планах — 188 аб'ектаў захавання ЦКА абодвух відаў і 108 кар'ераў.

Работа ідзе на кожным з узроўняў, пачынаючы ад сельскіх выканаўчых камітэтаў да рэспубліканскіх органаў кіравання.

— Праблем падчас выканання плана амаль не бывае, бо мы робім адну працу, — расказвае Руслан Міхалевіч. — Кожны ведае, за што ён адказвае. Акрамя таго, пры выканкамах створаныя штабы, куды ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых структур, у тым ліку і спецыялісты раённых інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Праз сумесныя рэйды, а таксама лакальныя маніторынг яны маюць магчымасць кантраляваць працэс рэкультывацыі і выкананне экалагічных і тэхнічных патрабаванняў.

Галоўная мэта рэкультывацыі як палігонаў, так і кар'ераў — вяртаць сельскагаспадарчыя землі ў гаспадарчы абарот. Іншыя ж адноўленыя землі могуць выкарыстоўвацца пад лесапасадку, луг і раллю, фруктовыя сады, для лыжных горак, аўтастаянак, складоў будматэрыялаў і інш.



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# ЧАКАННЯ

Так, напрыклад, на месцы былога кар'ера каля сталічнай кальцавой аўтадарогі з'явіўся аўтарынак «Малінаўка». Поласці пасля здабычы карысных выкапняў, калі блізка ад іх знаходзяцца грунтовыя воды, часам заліваюцца вадой, і новыя вадаёмы выкарыстоўваюцца ў рыбнай гаспадарцы, для пажарных і рэкрэацыйных мэт. (Для новых палігонаў і прамысловых кар'ераў гэтыя кірункі выкарыстання прапісваюцца ў праектнай дакументацыі.)

Да таго, як на месцы былога палігона вырасце лес ці з'явіцца поле, можа прайсці даволі шмат часу — да 20 гадоў. Аб'екты са значнымі аб'ёмамі захавання адходаў утрымліваюць так званы звалачны газ, які ўтварае пустоты ў палігоне. Каб газ поўнасцю выйшаў з аб'екта і той стабілізаваўся, і патрабуецца такі вялікі тэрмін.

> Сёння большасць міні-палігонаў вычарпалі свой рэсурс. Пры гэтым яны, у адрозненне ад буйных аб'ектаў захавання адходаў, амаль не адпавядаюць сучасным экалагічным патрабаванням.

— Працэс рэкультывацыі даволі просты, — расказвае Руслан Міхалевіч. — Пасля рашэння аб вывядзенні з эксплуатацыі палігона праводзіцца ўшчыльненне адходаў — апошнія пласты смецця засыпаюцца ізалюючым слоем і ўтрамбоўваюцца, каб у будучым пазбегнуць магчымага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Таўшчыня ўрадлівага слоя, які кладзецца зверху, залежыць ад прызначэння зямлі, на якой размешчаны палігон. Так, для новага лесу дастаткова і 0,25 метра, а вось для фруктовых садоў ужо патрэбны 1 метр глебы.

Пасля заканчэння тэхнічнага этапу рэкультывацыі палігонаў прыходзіць чарга біялагічнага. На гэта месца высаджваюцца лясныя культуры ці высяваюцца палявыя травы. У хуткім часе аднаўленая зямля перадаецца ў гаспадарчы абарот.

Падобны працэс адбываецца і падчас рэкультывацыі кар'ераў. Пры гэтым на тэхнічным этапе выкарыстоўваецца так званы метад выпалажвання — калі поласць засыпаецца зямлёй з прылеглых тэрыторый.

Але, на жаль, не ўсе праекты па рэкультывацыі становяцца паспяховымі. Галоўная прычына — нядобрасумленныя адносіны ўласнікаў аб'ектаў да выканання патрабаванняў. Так, у выніку распрацаваныя кар'еры бываюць нашмат глыбейшымі за нарматывы, іх не рэкультывуюць увогуле ці засыпаюць тым, што пад руку пападзецца, — смеццем, карыснымі выкапнямі з іншых кар'ераў і г. д. Часам адходы «вяртаюцца» і а рэкультываваныя палігоны. Прычым смецце звозяць туды як мясцовыя жыхары, так і некаторыя арганізацыі, якія адказваюць за гэтыя аб'екты.

## Перспектывы

Праблема навядзення парадку ў сферы выкарыстання зямлі абмяркоўваецца ў Беларусі на самым высокім узроўні. У студзені нараду па гэтых пытаннях праводзіў кіраўнік дзяржавы. Па распараджэнні прэм'ер-міністра створана рабочая група, куды ўваходзяць прадстаўнікі мясцовых уладаў, зацікаўленых ведамстваў (Дзяржкаммаёмасць, Мінпрыроды, Міністэрства па падатках і зборах, Мінфін і інш.). Свае прапановы выказваюць і іншыя дзяржорганы і кампаніі, дзейнасць якіх таксама звязаная з распрацоўкай кар'ераў.

На пасяджэннях групы абмяркоўваюцца пытанні фінансавання рэкультывацыі кар'ераў, правядзення прыродаахоўных мерапрыемстваў, абавязацельствы нетракарыстальнікаў.

— Разглядаюцца пытанні і змянення заканадаўства — з мэтай удасканаліць некаторыя адміністрацыйныя працэдуры, каб спрасціць парадак распрацоўкі кар'ераў, а таксама зрабіць больш жорсткімі меры ў частцы кампенсавання шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, — адзначае Сяргей Мамчык.

Удасканаленне заканадаўчай базы — важны этап работы ў сферы абыходжання з адходамі. Нормы дакументаў павінны быць празрыстымі і зразумелымі для ўсіх удзельнікаў працэсу, лічыць Руслан Міхалевіч. Дзякуючы гэтаму ўдасца пазбегнуць шматлікіх парушэнняў і зрабіць прыроду больш чыстай.

Пазбавіцца ад смеццевай праблемы павінна дапамагчы рэалізацыя Нацыянальнай стратэгіі абыходжання з ЦКА і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі да 2035 года. Адзін з яе модуляў прадугледжвае аптымізацыю сеткі палігонаў і міні-палігонаў па прынцыпе рэгіяналізацыі. Па словах Арцёма Шкрыля, у Мінжылкамгасе бачаць шлях развіцця ў тым, каб ствараць не некалькі аб'ектаў захавання адходаў у адным раёне, а адзін максімальна эфектыўны і экалагічна бяспечны на два-тры раёны. Па планах да 2035 года ў краіне павінна застацца не больш за 120 палігонаў.

— Новыя і існуючы палігоны павінны адпавядаць усім патрабаванням, і ў тым ліку не аказваць значнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, — адзначыў Руслан Міхалевіч. — Там будуць захоўвацца адходы, якія немагчыма перапрацаваць.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

### БУДАЎНІЧЫЯ АДХОДЫ — ПАДМУРАК ДЛЯ РЭКУЛЬТЫВАЦЫІ?

Чым правільна праводзіць рэкультывацыю кар'ераў — пытанне сёння адно з самых актуальных не толькі з боку экалогіі, але і эканомікі. Магчыма, ідэальным варыянтам будзе правядзенне рэкультывацыі інертнымі будаўнічымі адходамі. Навуковую распрацоўку па гэтай тэме плануюць правесці ў найбліжэйшы час вучоныя РУП «БелНДЦ «Экалогія». Праца аб'ядноўвае дзве важныя мэты: вярнуць землі, занятыя пад унутрыгаспадарчыя кар'еры, у гаспадарчы абарот і эфектыўна ўтылізаваць будаўнічыя адходы, што ўтвараюцца пасля зносу збудаванняў.

Па словах загадчыка аддзела абыходжання з адходамі БелНДЦ «Экалогія» Аляксея Кірэйкова, будаўнічыя адходы сёння таксама выкарыстоўваюцца пры рэкультывацыі кар'ераў, але многія з іх, нягледзячы на аднолькавы клас небяспекі, могуць як уплываць на наваколле, так і не ўплываць.

— Наша задача — распрацаваць дакладныя патрабаванні для кожнага віду будаўнічых адходаў і вызначыць, з дапамогай якіх з іх можна бяспечна праводзіць тэхнічны этап рэкультывацыі кар'ераў, — адзначыў навуковец.

Біялагічную частку рэкультывацыі плануецца рэалізоўваць з выкарыстаннем не толькі ўрадлівага слоя, але і субстрату, атрыманага пры кампаставанні арганічных адходаў гаспадарак (гною, драўніны, травы, лісця і інш.).

Як расказаў вядучы навуковы супрацоўнік аддзела комплексных экалагічных даследаванняў Алег Сазоненка, падчас даследаванняў будуць вызначаны ландшафтна-экалагічныя ўмовы (напрыклад, узровень залягання грунтовых водаў), пры якіх такая рэкультывацыя стане магчымай, а таксама разлічана эканамічная эфектыўнасць мерапрыемстваў і распрацаваны тыпавы бізнес-план рэкультывацыі. Пры паспяховай рэалізацыі праекта навуковыя распрацоўкі стануць своеасаблівым кіраўніцтвам да дзеяння.

Вынікі сваёй працы навукоўцы змогуць праверыць падчас рэкультывацыі аднаго з кар'ераў у сталічным рэгіёне.



**Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:**

— Сёння сапраўды існуе праблема з эксплуатацыяй старых палігонаў ЦКА. Неабходна распрацоўваць доўгатэрміновыя праграмы па іх рэкультывацыі і выкарыстанні ў адпаведнасці з усімі экалагічнымі нормамі. Хутка гэту праблему не вырашыць — патрабуюцца гады планамернай працы ў гэтым кірунку і значныя фінансавыя выдаткі.

Задачамі на найбліжэйшы час павінны стаць рэалізацыя Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, у якой запланавана паэтапная забарона захавання адходаў, што не прайшлі сартаванне; праца ў такіх прыярытэтных кірунках, як абясшкоджванне і выкарыстанне адходаў.

Радуе, што ў краіне распрацавана Нацыянальная стратэгія па абыходжанні з ЦКА і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі да 2035 года, якая прадугледжвае ў тым ліку ўкараненне дэпазітна-заЛогавай сістэмы, рэсурсазберажэнне і максімальнае выкарыстанне адходаў. Такі кірунак развіцця заканадаўства дапаможа знізіць колькасць смецця, што захоўваецца на палігонах.

А што датычыцца кар'ераў, то яшчэ дзесяць гадоў таму было шмат выпадкаў нерацыянальнага выкарыстання іх тэрыторыі, калі на гэтых месцах утвараліся звалкі. Сёння, дзякуючы рабоце тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды і мясцовых уладаў, такія выпадкі бываюць дастаткова рэдкія. На маю думку, па гэтым пытанні трэба працягваць растлумачальную работу з насельніцтвам, расказваць людзям, куды і чаму нельга выкідаць смецце.

НЕБЯСПЕКА

# З МЕСЦА — У КАР'ЕР

## *Лета — час, калі хочацца быць бліжэй да вады. Вось толькі не ўсякі вадаём можа быць для адпачывальніка бяспечным*

**Сацыяльныя сеткі поўняцца шматлікімі фотаздымкамі, зробленымі падчас купання ў кар'ерах. Але для выпадковых людзей гэтыя наватворныя азёры ўяўляюць вялікую небяспеку. Якую ж? Пра гэта расказаў вядучы спецыяліст рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.**

— На тэрыторыі нашай краіны любы грамадзянін мае права адпачываць там, дзе ён пажадае. Але ёсць асобныя водныя аб'екты, на якіх купацца і адпачываць забаронена. Разам з тым іх канчатковы спіс вызначае не Таварыства ратавання на водах, а выканаўчыя камітэты — абласныя або раённыя ці Мінскі гарадскі.

Калі ўзяць азёры ці рэкі, то іх берагі фарміраваліся на працягу соцень і нават тысяч гадоў. Яны маюць натуральную геадэзічную структуру, не такія падатлівыя да падмывання і магчымага абвальвання. Ды і тое мы дазваляем купацца не ва ўсёй акваторыі прыроднага вадаёма, а толькі ў вызначаных месцах. А што такое кар'ер? Гэта, як правіла, участак зямлі, куды аднойчы прыйшла цяжкая тэхніка, каб пачаць здабычу карысных выкапняў — мелу, торфу, пяску, гліны... Выемка грунту там рабілася не натуральным шляхам на працягу многіх стагоддзяў, а за лічаныя месяцы. А пасля здабываць у кар'еры не стала чаго. І тэхніка адтуль сышла. Натуральна, што такія «рукатворныя» аб'екты проста так прастойваць не будуць. І іх або наўмысна запоўнілі вадой, або адбыўся натуральны працэс — скажам, прабіліся крыніцы. Але берагі там няўстойлівыя.

> У 2015 годзе ў штучных вадаёмах патанула 50 чалавек. 2016 год выдаўся яшчэ больш сумным — купанне ў кар'ерах і копанках адабрала 75 жыццяў, з іх 12 ахвяр былі непаўналетнімі...

Так, часам у інтэрнэце сустракаюцца заклікі ператварыць кар'ер у прыгоднае для купання месца. Але насамрэч гэта нешта з разраду фантастыкі. Як умацаваць сыпучы бераг? Як можна ўвогуле назваць месца для купання бяспечным, калі глыбіня ў тэхнічным кар'еры можа складаць і 30, і нават 40 метраў? Вось уявіце сабе, што вы стаіце на краі кар'ера, і бераг раптам пачынае пад вамі абсыпацца... Працэс гэты ідзе лавінападобна, адскочыць вы не паспяваеце і ў імгненне вока разам з грунтам падаеце ў ваду. А зверху вас накрываюць тоны новага грунту... Выжыць у такой сітуацыі абсалютна нерэальна.

— Як вырашаецца праблема па абмежаванні вольнага доступу да такіх вадаёмаў? — задаецца пытаннем Алег Баразна. — Гэта можна паглядзець на прыкладзе Краснасельскіх мелавых кар'ераў, якія ў народзе празвалі «беларускімі Мальдывамі». Іх у рэшце рэшт абгарадзілі сеткай. Былі выстаўлены папераджальныя аншлагі. Тэрыторыю, якая прылягае да кар'ераў, пастаянна патрулююць зводныя атрады. У іх уваходзяць супрацоўнікі выканкамаў, міністэрстваў па надзвычайных сітуацыях і ўнутраных спраў, а таксама Таварыства ратавання на водах. Зразумела, што за кожным кустом чалавека не паставіш. Але па меры магчымасці верагоднасць доступу да кар'ераў скарачаецца...

А вось выпадкаў, калі кар'ер засыпалі, прыгадваецца толькі адзін. Здарылася гэта ў мінскім мікрараёне Брылевічы, калі там у кастрычніку 2014 года патануў хлопчык, — ён праваліўся пад тонкі лёд.

У 2015 годзе ў штучных вадаёмах патанула 50 чалавек. 2016 год выдаўся яшчэ больш сумным — купанне ў кар'ерах і копанках адабрала 75 жыццяў, з іх 12 ахвяр былі непаўналетнімі...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# БЕЛАРУСКІЯ МАЛЬДЫВЫ ЗАБАРОНЕНЫ

## Чаму маляўнічыя кар'еры пад Ваўкавыскам не сталі турыстычнай Меккай

**У адным з турыстычных агенцтваў, якое можа вазіць арганізаваныя групы па самых розных маршрутах, паведамілі, што заявак на наведванне мелавых кар'ераў да іх не паступала. Не чулі пра падобныя туры і ў дэпартаменце па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі. Што дазваляе зрабіць пэўныя вывады: да кар'ераў цягнуцца ў асноўным аматары экстрэмальнага адпачынку.**






### НЕБЯСПЕЧНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

Летась «дзікім» турыстам тут аб'явілі сапраўдную вайну. Паўсюдна ўстаноўлены знакі аб забароне наведвання мелавых кар'ераў, пад'езды перакрываюцца бетоннымі блокамі, асфальтавую дарогу да кар'ераў узнялі, прабаранавалі, — па ёй цяпер не праехаць. Арганізавана спецыяльная рэйдавая брыгада з ліку работнікаў прадпрыемства «Краснасельскбудматэрыялы». Члены групы патрулююць тэхналагічныя кар'еры і папярэджваюць аб небяспецы, якая можа напаткаць кожнага, хто знаходзіцца на гэтай тэрыторыі.

— Маляўнічыя пейзажы не такія бяскрыўдныя, як здаецца, — каторы раз тлумачыць **намеснік дырэктара прадпрыемства Генадзь НАЙДЗЮК.** — Берагі амаль вертыкальныя, яны ў любы момант могуць «спаўзці» і накрыць з галавой, а пранізаны вільгаццю мел хутка засмокча трапіўшага ў гэты абвал чалавека. Такія выпадкі здараліся.

На прадпрыемства неаднаразова прыязджалі следчыя органы ў сувязі з трагічнымі выпадкамі на кар'ерах. Больш за ўсё тут занепакоены купальшчыкамі, бо глыбіня кар'ераў даходзіць да некалькіх дзясяткаў метраў. «Ямы» пачынаюцца літаральна за метр ад берага. Пры няшчасным выпадку выратаваць чалавека ці аказаць яму экстранную дапамогу вельмі складана, папярэджвае прадстаўнік адміністрацыі прадпрыемства і прыводзіць такую несуцяшальную статыстыку: толькі за апошнія гады на кар'ерах Ваўкавыскага раёна патанулі 10 чалавек.

— Але па меры магчымасці вядзём рэкультывацыю адпрацаваных участкаў, — паведаміў Генадзь Найдзюк. — Мы не можам паставіць агароджу па ўсім перыметры кар'ераў, бо гэта вельмі працяглая тэрыторыя. Выраўноўваем берагавую лінію, пасля чаго кар'ер перадаецца лясной гаспадарцы для лесааднаўлення.

Генадзь Найдзюк адзначае, што прынятыя меры дазволілі знізіць ажыятаж вакол мелавых кар'ераў. Вось ужо некалькі гадоў, як наплыў турыстаў сюды значна скараціўся.

### СТРАТНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

Кар'еры ўзніклі пасля распрацоўкі прадпрыемствам «Краснасельскбудматэрыялы» мелавых радовішчаў. З цягам часу выкарыстаныя кар'еры запоўніліся вадой, якая набыла блакітна-бірузовы колер. За гэту асаблівасць мясцовасць і празвалі беларускімі Мальдывамі, тэрыторыя якіх роўная па плошчы 300 футбольным палям. Частка кар'ераў актыўна выкарыстоўваецца, частка ўжо адпрацавана і ўяўляе сабой блакітны каньён сярод лесу. Гэта тэрыторыя перададзена Ваўкавыскаму лясгасу.

У сваю чаргу леснікі наладзілі тут патруль і ахову. Сачыць за такой тэрыторыяй праблематычна, адзначыў **дырэктар Ваўкавыскага лясгаса Віталь БЕЛЫ.** Часта тут можна сустрэць рыбакоў. Як правіла, яны прыходзяць на самыя першыя кар'еры, дзе работы завяршыліся дзясяткі гадоў таму. Ліквідаваць сам каньён няпроста, бо яго глыбіня дасягае 30 метраў, тэрыторыя і схілы параслі лесам, таму зрабіць рэкультывацыю праблематычна.

Таксама ідзе марудна работа па рэкультывацыі кар'ераў, якія выйшлі з вытворчага абароту нядаўна, адзначылі ў Ваўкавыскім лясгасе. Гэта стрымлівае лесаўзнаўленне, бо бераг недастаткова выраўнены. Таму застаецца чакаць, калі лес сам вырасце. Ці не атрымаецца такая ж сітуацыя з чарговым кар'ерам плошчай 20 га, які будзе перададзены лясгасу сёлета? — задаецца пытаннем Віталь Белы. Самасей, на яго думку, не зусім эканамічны. Спецыяльная пасадка магла б даць значны прыбытак у выглядзе каштоўнай драўніны.

### А МОЖА, ГЭТА НОВЫ БРЭНД?

Мясцовыя прадпрымальнікі бачаць у беларускіх Мальдывах пэўны патэнцыял. **Раман ВАЎЧОК, каардынатар турыстычнай дэстынацыі «Па слядах старажытных шахцёраў»,** лічыць, што без наведвання кар'ераў яе маршрут будзе няпоўны. Да нядаўняга часу Раман вазіў групы на экзатычныя кар'еры, але з гэтага года беларускія Мальдывы пад забаронай нават для мясцовых жыхароў. Не апраўдаўся і намер стварыць тут кемпінг, хоць, на думку прадпрымальніка, на тэрыторыі кар'ераў нямала зручных мясцін для адпачынку, правядзення турыстычных злётаў, арганізацыі веларуху.

— Сюды прыязджаюць на веласіпедах, бо ёсць нямала сцяжынак і дарог вакол старых кар'ераў, — кажа Раман, — тэрыторыя нядрэнна падыходзіць для адпачынку, тут створана 5—6 вялікіх азёраў, месца прывабнае і магло б прыносіць прыбытак. Але ніхто не хоча гэтым займацца, прасцей зрабіць гэту тэрыторыю забароненай. У выніку ўзнікае «дзікі» турызм, які прыносіць галаўны боль многім зацікаўленым ведамствам.

Ва ўпраўленні спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама пацвердзілі інфармацыю аб забароне займацца турызмам на кар'ерах. Хоць раней, на піку папулярнасці беларускіх Мальдываў, узнікалі розныя прапановы. Але ў прадпрыемства не аказалася сродкаў, каб замацаваць берагі, і чарговая ідэя павісла ў паветры.

На думку **намесніка дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталя ГРЫЦЭВІЧА,** мясціны тут прывабныя, і пры належным падыходзе маглі б стаць цікавым турыстычным маршрутам. Напрыклад, можна было б ствараць пляцоўкі для агляду з фотасесій. Тым больш што такія кар'еры ёсць і ў Салігорску. Чаму б беларускім Мальдывам не стаць яшчэ адным турыстычным брэндам нашай краіны? — задаецца пытаннем прадстаўнік міністэрства.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
margo@zviazda.by

**Ігар КАШКЕВІЧ, намеснік старшыні Ваўкавыскага райвыканкама:**

